«АНЛАЙН» ПАД КАНТРОЛЕМ

МС

ЯК ПАДТРЫМАЦЬ ІМУНІТЭТ БЕЗ АПТЭЧКІ?

19

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 КРАСАВІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 76 (29445)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей РУДНЕЎ, першы намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг:

«Можна канстатаваць, што ўжо сёння электронны ўрад функцыянуе на поўную моц. Пры гэтым штодня мы атрымліваем новыя выклікі па забеспячэнні камфортнага атрымання дзяржаўных паслуг, адміністрацыйных працэдур ад дзяржавы для грамадзян і бізнесу. Гэта пацвярджае статыстыка. У мінулым годзе было аказана больш за 6,5 млн электронных паслуг, у 2019 годзе — крыху больш за 5 млн. Адпаведна дынаміка паказвае, што запатрабаванасць атрымання паслуг ад дзяржавы бізнесам і грамадзянамі расце штогод. Наша асноўная задача — у будучыні максімальна перавесці ў анлайн узаемадзеянне дзяржава — бізнес — грамадзяне».

КАРАТКА

- **Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў заслужаную артыстку Рэспублікі Беларусь Алену Спірыдовіч з юбілейнай датай.**
- У Савецкім раёне Мінска са 100-годдзем павіншавалі ветэрана ВАВ Івана Курындзіна.
- **У Беларусі стартавала праграма лячэння недробнаклетачнага раку лёгкага з дапамогай імунатэрапіі.**
- Цягнікі з Калінінграда будуць рабіць дадатковыя прыпынкі ў Беларусі.
- **Нацыянальная бібліятэка набыла 91 рэдкае выданне ў 2020 годзе.**

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У ГЭТЫМ ШАЛЁНЫМ СВЕЦЕ ТРЭБА БЫЦЬ БОЛЬШ СПАКОЙНЫМІ І ЖЫЦЬ ДРУЖНА»

Фота БелТА.

Учора ў Крамлі адбылася сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна

Лідары краін абмеркавалі актуальны парадак дня беларуска-расійскіх адносін, прадметна спыніўшыся на пытаннях гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, у тым ліку ў працяг сустрэч і тэлефонных размоў, якія адбыліся раней. У ліку прыярытэтных была саюзная тэматыка. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі сумеснае рэагаванне на актуальныя выклікі і пагрозы, абмяняліся думкамі аб міжнародным парадку дня, сітуацыі ў рэгіёне.

Каманды працуюць эфектыўна

У пачатку сустрэчы расійскі лідар заўважыў: «Нягледзячы на ўсе вострыя пытанні, якія мы сёння, напэўна, будзем абмяркоўваць, хацеў бы адзначыць, што адносіны ў нас развіваюцца, і развіваюцца паспяхова. Нягледзячы на пандэмію і пэўнае скарачэнне тавараабароту, усё ж такі аб'ём вельмі значны — амаль 30 млрд долараў. Упэўнены, што ўсё адновіцца і ў ранейшым аб'ёме».

СТАР. 2

Спажывец

Цэны, асартымент і бяспека тавараў

За якія парушэнні могуць прыпыніць работу магазінаў

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю час ад часу прыпыняе работу магазінаў. Так, нядаўна ў Брэсце закрылі расійскі дыскаўнтар «Святлафор», а ў Гродне — магазін сеткі «Марцін». Прычынамі такой меры паслужылі пратэрмінаваны тавар на паліцах магазінаў, невыкананне асартыментнага пераліку тавараў і парушэнні фарміравання цэн. Увогуле, міністэрства пільна сочыць за выкананнем заканадаўства аб гандлі ў аб'ектах усіх фарматаў. Карэспандэнт газеты «Звязда» даведалася, з якімі праверкамі прыходзілі ў гандлёвыя пункты наглядныя органы, і разабралася, па якіх прычынах у магазінах могуць вырасці цэны.

АЦЭНКА ПАРУШЭННЯЎ — У БАЛАХ

Толькі ў мінулым годзе МАРГ правяло кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы больш чым у 5 тысячах аб'ектах. У тым ліку маніторылі выкананне заканадаўства аб гандлі, грамадскім харчаванні і бытавым абслугоўванні насельніцтва, а таксама наяўнасць у крамах тавараў айчыннай вытворчасці ў 1119 аб'ектах.

СТАР. 4

Будзьце пільнымі!

ЗЛАДЗЕІ ЗА КАМП'ЮТАРАМ

Колькасць кіберзлачынстваў сёлета павялічылася ў разы

У нашай краіне назіраецца штогадовы рост злачынстваў, звязаных з інфармацыйнымі тэхналогіямі. Летась зарэгістравана больш за 25 тысяч кіберзлачынстваў. Лічбы растуць імкліва. Напрыклад, калі ў Мінскай вобласці пяць гадоў таму іх было каля 400 за год, то сёння — звыш 3300.

Сёлета такіх злачынстваў у сталічным рэгіёне становіцца больш у разы, паведаміў **начальнік упраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці крымінальнай міліцыі УУС Мінскага аблвыканкама Дзмітрый ДУДКОЎ.**

Трывожная статыстыка

«За першы квартал гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага практычна ў чатыры разы павялічылася колькасць крадзяжоў з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі — гэта звыш 800 злачынстваў, а ў мінулым годзе ў сталічным рэгіёне за гэты час было ўсяго толькі 210 выпадкаў. У працэнтных суадносінах крадзеж з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі складае 96,7 % ад усяго масіву зарэгістраваных кіберзлачынстваў. З 9,5 млн жыхароў Беларусі інтэрнэтам карыстаецца каля 7,9 млн чалавек, банкаўскіх плацежных картак па стане на 1 студзеня гэтага года было звыш 15 млн. Колькасць аперацый штогод расце, што прыцягвае крымінальных асоб у кіберасяроддзе», — адзначыў спецыяліст.

СТАР. 5

«У ГЭТЫМ ШАЛЁНЫМ СВЕЦЕ ТРЭБА БЫЦЬ БОЛЬШ СПАКОЙНЫМІ І ЖЫЦЬ ДРУЖНА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт Расіі расказаў, што абодва бакі працягваюць працаваць над удасканаленнем нарматыўнай базы па будаўніцтве Саюзнай дзяржавы. «Так, сапраўды, і там трэба будзе яшчэ шмат чаго зрабіць, але, тым не менш, зроблена таксама нямала. Асабліва гэта датычыцца сацыяльнай сферы. Нашы грамадзяне карыстаюцца роўнымі правамі ў сацыяльнай галіне: гэта пенсійнае забеспячэнне, працаўладкаванне, ахова здароўя. Шмат пазітыўнага ўжо зроблена», — падкрэсліў кіраўнік расійскай дзяржавы.

«Работа ў цэлым ідзе нядрэнна па ўсіх напрамках, каманды нашы працуюць вельмі эфектыўна. Я маю на ўвазе і ўрадавую каманду, і каманды па лініі адміністрацый, і, як бачым цяпер, па лініі спецыяльных службаў», — адзначыў Уладзімір Пуцін.

Таксама, паводле яго слоў, Беларусь і Расія паглыбляюць узаемадзеянне ў сферах ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва і гарантавання бяспекі «ў самым шырокім сэнсе гэтага слова».

Аляксандр Лукашэнка ў працяг падкрэсліў, што Беларусь і Расія сур'ёзна прасунуліся ў пытанні ўзгаднення саюзных праграм, прычым вельмі сур'ёзных. «Напэўна, 26 ці 27 праграм мы ўжо ўзгаднілі на ўзроўні ўрада. Трохі засталося, 2-3 вельмі сур'ёзныя праграмы эканамічнага характару, у тым ліку і падаткаабкладанне — вядомая праграма, па якой мы ўвогуле ў Мінску прынялі рашэнне, — заявіў Аляксандр Лукашэнка — Так што я з вамі згодны. Мы паволі рухаемся. Але ***ёсць на злобу дня пытанні, якія трэба ўзмацняць проста, у тым ліку і бяспека, абарона нашай Саюзнай дзяржавы. Хоць увогуле, напэўна, пакуль спраўляемся і справімся. І лініі намалюем, за якія ніхто не павінен перайсці, і годна адкажам тым, хто не разумее, што ў гэтым шалёным свеце трэба быць больш спакойнымі і жыць дружна»***.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў канцы мінулага года кіраўнікі дзяржаў склалі праграму сваіх дзеянняў. Прэзідэнты Беларусі і Расіі за апошні час двойчы сустракаліся ў Сочы, абмяркоўваючы розныя пытанні не толькі бягучага характару, але і стратэгічнага плана. Беларускі Прэзідэнт як выкананне гэтага плана ўспомніў нядаўні візіт у Мінск прэм'ер-міністра Расіі Міхаіла Мішусціна на чале расійскай дэлегацыі.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што летам трэба будзе правесці Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які сёлета будзе прымаць Маскоўская вобласць. ***«А затым мы прымем рашэнне аб пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета восенню, на якім ужо зможам фармалізаваць усе нашы дамоўленасці, падпісаўшы пэўныя дакументы»***, — заявіў беларускі лідар.

Не чужая суседка

Закранулі прэзідэнты падчас сустрэчы і ўкраінскае пытанне. У прыватнасці, Прэзідэнт Беларусі пракаменціраваў прапановы Украіны перанесці з Мінска перагаворную пляцоўку трохбаковай кантактнай групы па Данбасе.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што першапачаткова з просьбай арганізаваць у Беларусі перамоўную пляцоўку да яго звярнуліся Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, Прэзідэнт Украіны ў тыя гады Пётр Парашэнка. «Калі сёння не падабаецца, калі ласка, можна выбраць любую іншую краіну, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але трэба мець на ўвазе, што тут павінен быць кансэнсус тых, хто калісьці прапаноўваў». Прэзідэнт Беларусі дадаў: калі прэзідэнты Расіі і Украіны, іншыя далучаныя да працэсу прымуць адпаведнае рашэнне, то, вядома, група будзе працаваць у іншым месцы.

«А наогул, у нас кажуць так: баба з воза — каню лягчэй. Таму калі ласка. Мы ж асабліва не перажываем з прычыны гэтых заяў. Хоць яны заявілі, а потым ужо абверглі гэтыя заявы. Нібыта Прэзідэнт адмовіўся нават абмяркоўваць гэтую праблему. Дурасць несусветная. Што тут абмяркоўваць...» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Пуцін на гэты конт сказаў: «Беларусь проста дала нам пляцоўку і наогул не ўмешваецца ў гэты працэс. Ніяк. Проста стварыла ўмовы для работы тым, хто хоча шукаць шляхі вырашэння праблемы. Калі хтосьці не хоча гэтым займацца, тады, вядома, прычыны не працаваць у гэтай, на мой погляд, вельмі важнай сферы заўсёды можна знайсці. Падобна на тое, што гэта пошук такіх прычын ухіліцца ад абмеркавання праблемы Данбаса».

«І пахаваць Мінскія пагадненні», — дадаў у працяг тэмы Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Уладзімір Пуцін заявіў, што расійскі бок гатовы прыняць у Маскве прэзідэнта Украіны. Раней Уладзімір Зяленскі прапанаваў свайму расійскаму калегу Уладзіміру Пуціну правесці перагаворы на Данбасе, каб абмеркаваць пытанні ўрэгулявання канфлікту ў гэтым рэгіёне.

«Што датычыцца прапановы ўкраінскага кіраўніцтва і прэзідэнта Зяленскага, хацеў бы сказаць наступнае. Апошнім часам дзеючае кіраўніцтва Украіны зрабіла вельмі шмат крокаў, якія разбураюць расійска-ўкраінскія адносіны», — сказаў Уладзімір Пуцін. Паводле яго слоў, гэта датычыцца шэрагу праблем у двухбаковых адносінах наўпрост, адносін украінскага кіраўніцтва да Рускай праваслаўнай царквы і, па сутнасці, спробы яе разбурэння, адносін да рускай мовы і рускамоўных грамадзян Украіны, а таксама да расійскіх грамадзян, якія пражываюць ва Украіне. «Вельмі шмат было крокаў, накіраваных на разбурэнне нашых адносін. Пра што мы, безумоўна, можам толькі шкадаваць, — заявіў кіраўнік расійскай дзяржавы. — Але калі прэзідэнт Зяленскі хоча пачаць аднаўленне гэтых адносін, мы будзем гэта толькі вітаць».

«Узнікае пытанне: мы што хочам абмяркоўваць на гэтай сустрэчы? Калі гаворка ідзе пра абмеркаванне праблем Данбаса, то тады, у першую чаргу, кіраўніцтва Украіны павінна сустракацца з кіраўнікамі рэспублік — ЛНР і ДНР. А ўжо потым абмяркоўваць гэтыя праблемы з прадстаўнікамі трэціх краін, якой у дадзеным выпадку з'яўляецца Расія», — звярнуў увагу Уладзімір Пуцін.

Калі ж ёсць неабходнасць абмеркаваць развіццё двухбаковых адносін, то, падкрэсліў расійскі лідар, у Маскве гатовыя прыняць прэзідэнта Украіны ў любы зручны для яго час.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з такім падыходам расійскага калегі. «Калі яны хочуць з Данбасам размаўляць, можна і ў Данбасе — хай сустракаюцца, правільна? Гэта ж іх справа», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Мне здаецца, Уладзімір Уладзіміравіч, Зяленскаму ўжо пара навучыцца канкрэтна дыпламатычна сябе паводзіць, акрамя ўсяго іншага. Гэта датычыцца Данбаса», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

* * *

У ходзе пратакольнай часткі сустрэчы Прэзідэнт Беларусі таксама выказаўся аб пасланні Прэзідэнта Расіі Федэральнаму сходу. «Штогадовае пасланне Прэзідэнта — гэта заўсёды вялікая праца. Гэта праца вельмі многіх людзей. Але ўсё роўна нагрузка кладзецца на Прэзідэнта. Яму вызначаць, якім мусіць быць пасланне. Мы заўважылі вялікую чалавечую нотку гэтага паслання. Абсалютна згодны з тымі высновамі, якія былі зробленыя. Асабліва падтрымліваю той ухіл, які быў вамі ўзяты ў гэтым пасланні, — менавіта чалавек», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што краіны сутыкаюцца з падобнымі праблемамі ў пытанні дэмаграфіі, таму важна прымаць меры для павышэння нараджальнасці, падтрымкі шматдзетных сем'яў. ***«Мы маем прыкладна тую ж падтрымку, забяспечваем падтрымку людзям, шматдзетным асабліва. Гэта прырытэт нашай краіны.*** Таму ў нас гэта ўспрынята з адабрэннем», — адзначыў беларускі лідар.

Паводле БелТА.

У цэнтры ўвагі

ПРАМАЯ І АДКРЫТАЯ РАЗМОВА

Учора Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА наведала Мінскі завод колавых цягачоў. У ходзе сустрэчы з працаўнікамі прадпрыемства адбылася зацікаўленая размова па розным спектры пытанняў.

У самым пачатку размовы Наталля Качанава звярнулася да прысутных з просьбай правесці размову ў фармаце дыялогавай пляцоўкі, бо рэжым гутаркі «пытанне — адказ», на яе погляд, больш правільны і функцыянальны. Так яно і атрымалася.

Некалькі слоў пра месца сустрэчы. Сёння Мінскі завод колавых цягачоў — гэта слыннае беларускае прадпрыемства з міжнароднай вядомасцю. Яго прадукцыя выпускаецца пад гандлёвай маркай «Volat», ці па-беларуску «Волат». Вырабы завода колавых цягачоў шырока выкарыстоўваюцца пры выпуску розных узораў ваеннай і грамадзянскай тэхнікі. «Волат», нагадаем, спецыялізуецца на дарожных і пазадарожных аўтамабілях вялікай грузападымальнасці, прычапной тэхніцы, спецыяльных колавых шасі пад мантаж абсталявання для будаўнічага, нафтагазавага і машынабудаўнічага комплексаў. Да 1991 года прадпрыемства ўваходзіла ў склад Мінскага аўтамабільнага завода. Зараз гэта дзяржаўнае прадпрыемства і знаходзіцца яно ў падпарадкаванні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі. Форма ўласнасці — адкрытае акцыянернае таварыства.

У час прамой і свабоднай размовы спікер верхняй палаты парламента выказала і свой пункт погляду на эканамічную сітуацыю ў краіне і Мінску, сказала аб ролі прамысловых прадпрыемстваў сталіцы ў выкананні прагнозных паказчыкаў, аб падтрымцы дзяржавай шматдзетных сем'яў. Наталля Качанава таксама раскрыла сутнасць і сапраўдныя намеры і планы тых дэструктыўных сіл, якія з-за мяжы імкнуцца расхістаць стабільную сітуацыю ў краіне.

На думку старшыні Савета Рэспублікі, не толькі прысутным у зале, але і ўсім нам трэба ўмець супастаўляць факты і падзеі, аналізаваць сённяшнюю сітуацыю ў краіне для таго, каб ясна разумець, як лёгка страціць тое, што напрацоўвалася гадамі. Паводле слоў Наталлі Качанавай, сёння нам ёсць чым ганарыцца, бо за 26 гадоў мы пабудавалі такую краіну, у якой кожны пры жаданні можа знайсці прымяненне сваім сілам, здольнасцям і таленту, што б ні пісалі і ні казалі нядобразычліўцы.

На жаль, не ўсе з іх хочуць сумленна працаваць. Наталля Качанава прывяла статыстыку па Мінску. У сталіцы афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных 900. З іншага боку, вакансій у сталіцы каля 19 тысяч. А вось колькасць гарадскіх непрацоўных уражвае: 68 тысяч! З іх 12 тысяч не працуюць ужо больш за 10 гадоў! І самае цікавае, што яны ў большасці сваёй няблага жывуць.

На погляд Наталлі Качанавай, сёння трэба вельмі рацыянальна выкарыстоўваць працоўныя рэсурсы ў кожным рэгіёне. Яна згадала нядаўняе выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі на базе Мінскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа імя акадэміка Міхаіла Высоцкага, дзе сенатары грунтоўна разгледзелі праблемы прафесійнай адукацыі і шляхі павышэння прэстыжу рабочых спецыяльнасцяў.

Спікер верхняй палаты парламента адказала на пытанні прысутных, якія мелі пераважна сацыяльны характар, напрыклад аб арэндным жыллі.

Адразу пасля дыялогу з работнікамі прадпрыемства Наталля Качанава правяла асабісты прыём грамадзян.

Леанід ТУГАРЫН.

Блізкая ўлада

НА КАРЫСЦЬ ЛЮДЗЕЙ

Маёмасныя пытанні і абарона правоў дзяцей — з такімі праблемамі на выязны прыём грамадзян звярнуліся жыхары Магілёўскай і Мінскай абласцей да намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольгі ЧУПРЫС, які прайшоў у Чэрыкаўскім райвыканкаме, паведаміла БелТА.

За вырашэннем сваіх праблем сюды звярнуліся жыхары Мінска, Магілёва, Крычава і Чэрыкава. Па словах Вольгі Чупрыс, выязныя прыёмы грамадзян — своеасаблівая зваротная сувязь. «Гэтыя прыёмы даюць магчымасць і для самой улады зразумець, што не так на месцах, што трэба падкарэкціраваць. Дзесьці бачым варыянты ўдасканалення заканадаўства, арганізацыйнай работы ў органах улады. Потым кіруемся гэтым у практычнай дзейнасці», — падкрэсліла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Таксама Вольга Чупрыс падзялілася новаўвядзеннямі, якія ў найбліжэйшай будучыні з'явяцца ў рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб. «Задумка Адміністрацыі Прэзідэнта аб стварэнні адзінай аўтаматызаванай сістэмы ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян Беларусі была даўно — і рэалізацыя гэтай работы ўжо пачалася. Паколькі задача складаная (гэта ўкараненне інфармацыйных тэхналогій, распрацоўка пэўнага праграмнага забеспячэння), то не была вырашана ў адзін дзень і нават год. Але ўжо сёлета з'явіліся пробныя ўзоры такой сістэмы, і да канца года яна павінна быць укаранёная ў жыццё. Наша галоўная мэта — павышэнне эфектыўнасці ў рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, — падкрэсліла Вольга Чупрыс. — Чалавек зможа падаць свой электронны зварот і далей адсачыць працэс работы з ім. Пры гэтым органы дзяржаўнага кіравання будуць мець магчымасць адсочваць рух звароту, напрыклад, ад раённага выканкама і да Адміністрацыі Прэзідэнта. Мы будзем бачыць, як мяняўся ход звароту, як далей падаваліся гэтым грамадзянінам яшчэ некалькі звязаных зваротаў, якія рашэнні па гэтым звароце прымаліся мясцовымі ўладамі, вышэйстаячымі органамі ўлады — гэта значыць, увесь ход работы са зваротам чалавека. І заяўнік таксама ўбачыць, як вялася дзейнасць па яго праблеме. Спадзяёмся, што такая работа пойдзе на карысць. Да канца года Міністэрства сувязі плануе запусціць сістэму ў выніковую эксплуатацыю».

Вас пачуюць

ЗВАНКІ З АДКАЗАМ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 24 красавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

• кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

• першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васілевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44

Сацыяльны вектар

НА ПАГАШЭННЕ КРЭДЫТАЎ І АПЛАТУ АДУКАЦЫІ

Напрамкі выкарыстання сямейнага капіталу прапануюць павялічыць

Пра гэта і апошнія дэмаграфічныя трэнды расказала начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА.

Па яе словах, з 2015 года адкрыта больш чым 97 тысяч укладаў сямейнага капіталу на агульную суму 2,5 мільярда беларускіх рублёў. «Гэта лічба супастаўная з гадавымі выдаткамі на ўсю сістэму дзяржаўных дапамог сем'ям з дзецьмі», — звярнула ўвагу начальнік упраўлення.

Датэрмінова сямейны капітал выкарыстала 31 тысяча шматдзетных сем'яў. «Дастаткова актыўна пачалося выкарыстанне сродкаў сямейнага капіталу з 2020 года, калі былі ўнесены змены ў заканадаўства і было дадзена права датэрміновага выкарыстання на такія першачарговыя напрамкі для шматдзетных сем'яў, як будаўніцтва жылля і атрыманне адукацыі», — адзначыла спецыяліст Мінпрацы. Паводле яе слоў, ва ўрад ужо ўнесены праект указа па пашырэнні напрамкаў выкарыстання сямейнага капіталу. Прапаноўваецца выдаткоўваць сямейны капітал на пагашэнне крэдытаў грамадзян, якія самастойна заключылі дагаворы на будаўніцтва жылля, пагашэнне пазык арганізацыям па месцы працы грамадзян, набыццё долі на права ўласнасці на жылёвае памяшканне, на медыцынскія паслугі ў сферы артапедыі, набыццё тавараў сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі інвалідаў, аплату адукацыі ў ВНУ і ССУА спажывецкай кааперацыі і Федэрацыі прафсаюзаў.

Марына Арцёменка адзначыла, што ўсяго ў краіне налічваецца 2 мільёны 612 тысяч сем'яў, з іх больш за 1 мільён 140 тысяч мае дзяцей да 18 гадоў. Адно дзіця выхоўваюць амаль 60 % сем'яў, дваіх — 31,4 %, траіх і больш — 8,7 %.

«У параўнанні з данымі перапісу 2009 года ў нас знізілася доля аднадзетных сем'яў і павялічылася доля сем'яў з двума, трыма і больш дзецьмі. Гэта сведчанне таго, што ўсе меры, якія прымаліся ў апошнія гады і былі накіраваны на падтрымку шматдзетных сем'яў, далі свой вынік», — падкрэсліла Марына Арцёменка. Паводле яе слоў, у Беларусі налічваецца больш за 114 тысяч шматдзетных сем'яў.

Сярод дэмаграфічных трэндаў — павелічэнне колькасці бацькаў-адзіночак. Колькасць няпоўных сем'яў, дзе дзяцей выхоўвае толькі тата, з 2009 года павялічылася больш чым у два разы. Як дадала Марына Арцёменка, праводзіцца маніторынг выкарыстання мужчынамі «бацькоўскага адпачынку» і разглядаецца магчымасць унясення ў Працоўны кодэкс нормаў, якія накіраваны на спрыяльнае сумяшчэнне прафесійных і сямейных абавязкаў.

З'яўленне дзяржпраграмы сямейнага капіталу станоўча паўплывала на сітуацыю з нараджэннем трэціх і наступных дзяцей. З 2015 года такіх дзяцей нараджаецца каля 20 тысяч у год, іх доля ў агульным ліку нараджэнняў складае 23 %.

Сярод тэндэнцый, пра якія паведаміла Марына Арцёменка, — зніжэнне колькасці шлюбаў і павелічэнне колькасці разводаў. Амаль кожны трэці развод прыпадае на сямейныя пары, якія пражылі ў шлюбе 5—9 гадоў. Сярод скасаваных шлюбаў найбольшая ўдзельная вага прыпадае на пары ва ўзросце 30—39 гадоў. Як падкрэсліла спецыяліст, дзяржава робіць шмат для захавання і ўмацавання інстытута сям'і.

Марыя ДАДАЛКА.

МЕДЫЦЫНСКІЯ НАВІНКІ ДЛЯ ДЗІЦЯЧАГА ЗДАРОЎЯ

На відэабрыфінгу Нацыянальнага прэс-цэнтра намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі — начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Дзмітрый ЛАЗАР расказаў пра новыя метады лячэння ў сферах дзіцячай анкалогіі, траўматалогіі, хірургіі, укаранёныя айчыннымі спецыялістамі.

Укараняюць беларускія дзіцячыя анколагі інавацыйную CAR-T-тэрапію, якая ўяўляе сабой метад лячэння злаякасных новаўтварэнняў з выкарыстаннем уласных рэсурсаў імуннай сістэмы пацыента. Яе сутнасць заключаецца ў тым, што медыкі здабываюць з цела пацыента імунныя клеткі, перапраграмуюць іх і вяртаюць назад у арганізм.

«Пры супрацоўніцтве РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі і Інстытута біяарганічнай хіміі НАН распрацаваны хімерны антыгенны рэцэптар (CAR), нацэлены на пухлінаасацыяваны антыген У-лінейных лейкозаў і лімфы. Лімфацыты вяртаюць у арганізм рэцыпіента, дзе яны выяўляюць пухлінавыя клеткі, распазнаюць іх дзякуючы наяўнасці хімернага антыгеннага рэцэптара і знішчаюць», — адзначыў Дзмітрый Лазар.

CAR-T-тэрапія праведзена ўжо двум пацыентам.

У РНПЦ траўматалогіі і артапедыі распрацаваны і апрабаваны спінальныя імплантацыйныя сістэмы, з выкарыстаннем якіх ажыццяўляюцца радыкальныя аптымальныя рэканструкцыйна-карыгіруючыя аперацыі пры дэфармацыі пазваночніка на глебе прыроджаных анамалій развіцця пацыентаў усіх узростаў.

«Гэта медыцынская тэхналогія ўкаранёна непасрэдна ў РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, а таксама ў Гомельскай дзіцячай абласной клінічнай бальніцы і Гомельскай абласной клінічнай бальніцы», — дадаў Дзмітрый Лазар.

Акрамя таго, як паведаміў спецыяліст, беларускімі хірургамі ўкаранёна аперацыя Азакі, пашыраны паказанні для выканання радыкальнай хірургічнай карэкцыі прыроджаных парокаў сэрца ў неданошаных і малавагавых дзяцей. У 2020 годзе ўпершыню выканана імплантацыя транскатэтэральнага клапана лёгачнай артэрыі і нацыянальна трохстворкавага клапана пацыенту з парокам сэрца.

Па словах спецыяліста, з 2016 года назіраецца значнае зніжэнне нараджальнасці і павялічваецца ўзрост мацярынства. У 2016 годзе ён быў 29 гадоў, а ўжо ў 2019-м — 30 гадоў. Па яго словах, выкарыстанне ЭКА — рэзерв павелічэння нараджальнасці, і ў краіне дастаткова ўстаноў, якія праводзяць такія маніпуляцыі. Бясплатная спроба ЭКА будзе праводзіцца ў РНПЦ «Маці і дзіця», раддоме № 2 Мінска, Гомельскім абласным дыягнастычным медыка-генетычным цэнтры з кансультацыяй «Шлюб і сям'я».

«На дадзеным этапе ў нас працуюць рэгіянальныя камісіі па падборы пацыентаў для бясплатнай спробы ЭКА. Прыняты дакументы ад 450 пар. У выніку многія, хто звярнуўся, маюць патрэбу ў дадатковым абследаванні, кансультацыі ўрачоў-спецыялістаў, накіраванні ва ўстановы аховы здароўя, — заявіў спецыяліст Міністэрства аховы здароўя. — Хачу звярнуць увагу, што, згодна з нарматыўна-прававым актам аб бясплатнай адной спробе, ЭКА праводзіцца толькі яйцаклеткай жонкі і сперматазоідам мужа. Донарскія не могуць быць выкарыстаны».

Дзмітрый Лазар паведаміў, што ў РНПЦ «Маці і дзіця» ў студзені 2021 года ўпершыню ў краіне адкрылася аддзяленне спадчынных нервова-мышачных захворванняў у дзяцей. На яго аснове функцыянуе Рэспубліканскі цэнтр спадчынных нервова-мышачных захворванняў, дзе аказваецца высокаспецыялізаваная медыцынская дапамога дзецям. «Распрацаваны і актыўна папаўняецца інфармацыяй па пацыентах рэгістр спадчынных нервова-мышачных захворванняў для дзяцей. Міністэрства аховы здароўя ў мінулым годзе ініцыявала ўключэнне дзяцей са СМА ў глабальную праграму кіраванага доступу для магчымасці бясплатнага атрымання генетычнага лекавага сродку «Золгенсма». Камерцыйная цана такога прэпарату — 2 мільёны 125 тысяч долараў на аднаго пацыента», — канстатаваў супрацоўнік міністэрства.

За 2020 год у праграму ўключаны шэсць пацыентаў. Да гэтага часу магчымасць бясплатнага лячэння выйгралі тры дзіцяці з Беларусі. Міністэрствам здароўя была распрацавана лагістыка і пракантраляваны ўсе этапы ўвозу гэтага лекавага сродку ў краіну. Генная тэрапія праведзена ўсім тром пацыентам. Міністэрства аховы здароўя таксама ініцыявала работу па арганізацыі доступу да іншых інавацыйных прэпаратаў генная тэрапіі дзяцей са СМА, прапрацоўваецца лагістыка ўключэння пацыентаў у гуманітарную праграму дарэгістрацыйнага доступу да прэпарату «Рысдыплам».

Марыя ДАДАЛКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Спажыўцы за час пандэміі назапасілі дадаткова $5,4 трлн

Гэта эквівалентна шасці працэнтам глабальнага ВУП, паведаміла Moody's. Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва вызначае такі лішак як дадатковую эканомію ў параўнанні з мадэллю расходаў у 2019 годзе. Пры гэтым імклівы рост спажывецкага даверу сведчыць, што пакупнікі зноў будуць гатовы выдаткаваць грошы, як толькі крамы, бары і рэстараны адновяць работу пасля зняцця каранцінных абмежаванняў, уведзеных для абмежавання распаўсюджвання захворвання. У першым квартале гэтага года глабальны індэкс спажывецкага даверу, які разлічвае Conference Board, дасягнуў самага высокага значэння з моманту пачатку яго падліку ў 2005-м, пры гэтым рост цэн зафіксаваны ва ўсіх рэгіёнах свету, адзначыла Financial Times. «Вызваленне значнага адкладзенага попыту ў спалучэнні з празмерным аб'ёмам дадатковых зберажэнняў выкліча ўсплёск спажывецкіх расходаў ва ўсім свеце па меры таго, як краіны набліжаюцца да калектыўнага імунітэту і адкрываюць свае эканомікі», — мяркуе галоўны эканаміст Moody's Analytics Марк Занд. Калі спажыўцы выдаткуюць каля траціны дадатковых зберажэнняў, яны павялічаць сусветны аб'ём вытворчасці на 2 працэнтныя пункты ў гэтым годзе і ў наступным, лічаць аналітыкі агенцтва.

У Індыі за суткі выявілі амаль 315 тысяч выпадкаў кавіду

Гэта рэкордны прырост сярод краін свету, паведаміла агенцтва Associated Press. Агульная колькасць выпадкаў заражэння каранавірусам у краіне перавысіла 15,9 млн. Індыя займае другое месца ў свеце па колькасці выпадкаў COVID-19 пасля ЗША, сведчаць даныя ўніверсітэта Джонса Хопкінса. На фоне росту захворванняў бальніцы ў Індыі не спраўляюцца з нагрузкай і адчуваюць недахоп кісларoду для цяжкахворых пацыентаў. Па словах галоўнага міністра Дэлі Арвінда Кеджрывала, калі колькасць новых заражэнняў не зменшыцца, сістэма аховы здароўя можа развaліцца. Пры гэтым эпідэміялагічная сітуацыя ў Індыі працягвае пагаршацца: за чатыры дні ў краіне выявілі мільён новых выпадкаў COVID-19, паведамляе выданне Times of India. Прэм'ер-міністр краіны Нарэндра Модзі, тым не менш, выступае супраць жорсткага лакдаўну. «Я заклікаю штаты, каб яны разглядалі лакдаўн як апошні варыянт. Яны павінны шчыра паспрабаваць пазбегнуць лакдаўну і сфакусіравацца на мікразонах заражэння», — сказаў Модзі.

Навукоўцы вызначылі памеры папуляцыі тыраназаўра

Палеантолагі Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Берклі падлічылі, што папуляцыя тыраназаўра (Tyrannosaurus Rex), які жыў у заходняй частцы Паўночнай Амерыкі, адначасова налічвала каля 20 тысяч асобін. «Дагэтуль нікому не ўдавалася вызначыць колькасць даўно вымерлых жывёл», — адзначаецца ў паведамленні ўніверсітэта. Навукоўцы выкарысталі камп'ютарнае мадэляванне, абапіраючыся на даныя, апублікаваныя Джонам Дамутам з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Санта-Барбары, якія звязваюць масу цела са шчыльнасцю папуляцыі жывёл. У разліках навукоўцы зыходзілі з таго, што палавой сталасці тыраназаўры дасягалі да 15 з паловай гадоў, а максімальная працягласць іх жыцця складала каля 20 гадоў. Сярэдняя вага дарослых жывёл складала 5-7 тон. Паводле разлікаў навукоўцаў, за час існавання віду — каля 2,5 мільёна гадоў — на Зямлі жыло прыкладна 2,5 млрд тыраназаўраў, аднак да гэтага часу знойдзена менш чым 100 асобін, многія з якіх прадстаўлены адной скамянелай косткай.

Надвор'е

МОКРЫ СНЕГ — З ПОЎНАЧЫ ЕЎРОПЫ

Красавік — месяц зменлівы. Вось і гэтым разам цёплае надвор'е пакідае нашу краіну. Калі ў чацвер удзень было ў сярэднім 10—17 цяпла, то сёння стане на 5—8 градусаў халадней, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Ужо ў пятніцу ўдзень у многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У дзённыя гадзіны месцамі магчымы навальніцы.

На выхадныя наша краіна будзе знаходзіцца пад уплывам франтальных раздзелаў і халодных няўстойлівых паветраных мас, якія распаўсюджваюцца з боку поўначы Еўропы. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Вецер будзе заходні, паўночна-заходні парывісты, удзень у асобных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы апусціцца ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла. Удзень паветра прагрэецца да плюс 3—9 градусаў. Такі тэмпературны фон на 2—5 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму для гэтых красавіцкіх дзён.

У пачатку наступнага тыдня захаваецца халоднае надвор'е. У панядзелак уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Вецер будзе заходні, паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны апусціцца ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла. Днём чакаецца таксама малакамфортнае надвор'е — ад 3 да 9 градусаў цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак атмасферны ціск пачне расці, аблокаў і ападкаў стане менш. Вецер будзе заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы — мінус 4 — плюс 2 градусы. Удзень паветра прагрэецца да 4—11 цяпла. У сераду прагназуецца пераменная воблачнасць. Уначы пераважна без ападкаў, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы туман. Тэмпература паветра ноччу — ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла. Удзень будзе адносна цёпла — плюс 7—14 градусаў вышэй за нуль.

Сяргей КУРКАЧ.

Перспектыва

ПАЛАЦ З ІГОЛАЧКІ

У Добрушы выйшаў на фінішную прамую праект, завяршэння якога з нецярпеннем чакаюць жыхары райцэнтра. Гаворка ідзе аб адкрыцці пасля капітальнага рамонту і мадэрнізацыі раённага Палаца культуры. Яго будынак быў узведзены ў канцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Калі паўстала пытанне аб тэрміновым капрамонце аб'екта, пачалася распрацоўка праектна-кашторыснай дакументацыі.

Капрамонт з элементамі мадэрнізацыі на аб'екце пачаўся ў верасні 2018 года.

— Гэты Палац культуры быў пабудаваны ў 1927—1929 гадах для работнікаў Добрушскай папяровай фабрыкі «Герой працы». Асноўны будынак, які ўцалеў у гады Вялікай Айчыннай вайны, быў пашыраны за кошт прыбудоў ужо ў 70-х гадах мінулага стагоддзя, — растлумачыла **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Добрушскага райвыканкама Алена РАЗДУЕВА.**

За работай брыгадзір брыгады маляроў Марына НЯКРЭВІЧ.

Пасля заканчэння маштабных работ палац па праве стане эпіцэнтрам культурнага жыцця раёна. Падчас капрамонту на аб'екце былі заменены паддахавыя і міжпавярховыя перакрыцці з драўняных на жалезабетонныя, канструктыў падлог у памяшканнях, сістэмы электразабеспячэння, водаправода і каналізацыі. Таксама адрамантаваны дах, уваходная група, адноўлены фасад будынка, усталяваны новы пандус для маламабільных людзей. Дарэчы, усе складнікі безбар'ернага асяроддзя ў памяшканні Палаца культуры будуць забяспечаны ў поўным аб'ёме. У тым ліку прадугледжаны адмысловы санвузел для інвалідаў-калясачнікаў, у глядзельнай зале — дзевяць месцаў з палегчаным пад'ездам на інвалідных крэслах.

— Што датычыцца мадэрнізацыі Палаца культуры, то запланавана правесці мехнізацыю сцэны глядзельнай залы, устанавіць заслону з электрапрывадам, сучаснае асвятляльнае абсталяванне сцэны і ўсіх памяшканняў, сістэмы вентыляцыі і кандыцыяніраванне глядзельнай залы, правесці дэкаратыўнае асвятленне фасада будынка, — звярнуў увагу **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Будаўнічы трэст № 14» Дзмітрый МУРАШКА.**

Брыгады рабочых будаўнічага прадпрыемства на аб'екце зараз працягваюць будаўніча-мантажныя работы.

— У змену на аб'екце над аздабленнем унутраных памяшканняў і фасадаў будынка працуе сем спецыялістаў маляроў-тынкоўшчыкаў, — падзяліўся **брыгадзір брыгады маляроў філіяла «Спецыялізаванае ўпраўленне № 47» ААТ «Будаўнічы трэст № 14» Марына НЯКРЭВІЧ.**

Работы па рамонце ўваходнай групы і добраўпарадкаванні тэрыторыі.

Паралельна працягваецца закупка тэхналагічнага, музычнага, акустычнага абсталявання, мэблі. Распачаты работы па добраўпарадкаванні прылеглай тэрыторыі. У палацы культуры новая глядзельная зала з балконам змесціць амаль 400 гледачоў. Сцэна разлічана на выступленне 59 чалавек. Для правядзення масавых мерапрыемстваў будзе таксама выкарыстоўвацца вялікае ўтульнае фае, побач прадугледжаны грымёрныя пакоі, кабінеты акампаніятараў і кіраўнікоў творчых калектываў, пакоі для інжынераў па гуку і святле, рэжысёраў. Другі паверх адведзены для адміністрацыі ўстановы культуры, тут жа будзе размяшчацца Добрушская цэнтральная раённая бібліятэка.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота ААТ «Будаўнічы трэст № 14».

Цэны, асартымент і бяспека тавараў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асноўнай тэматыкай кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў стала даследаванне цэнавай сітуацыі на спажывецкім рынку. Тут кантроль ажыццявілі больш чым у 4 тысячах аб'ектаў. Таксама сачылі за тым, каб на паліцах магазінаў быў шырокі асартымент тавараў і не ўзнікала яго дэфіцыту. Але асаблівую ўвагу ўдзялілі наяўнасці сацыяльна значных тавараў і абследавалі ў гэтым кірунку звыш 1,1 тысячы аб'ектаў.

З пачаткам пандэміі міністэрства пільна сачыла і за аптэкамі. Так, у фокусе яго ўвагі аказалася звыш 2 тысяч аптэк, у якіх праверылі наяўнасць медыцынскіх масак і антысептычных сродкаў, а таксама ўзровень цэн на іх.

Маніторылі гандлёвыя аб'екты і на прадмет захавання рэкамендацый МАРГ і патрабаванняў санітарных норм і правілаў, якія датычацца прафілактыкі COVID-19.

Па выніках маніторынгаў суб'ектам гаспадарання, якія парушылі заканадаўства, выдадзена 740 рэкамендацый па ліквідацыі выяўленых парушэнняў, 170 прадпісанняў аб забароне рэалізацыі тавараў са скончаным тэрмінам прыдатнасці. Па фактах парушэнняў, устаноўленых у ходзе паўторных маніторынгаў, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 72 вінаватыя асобы, сума штрафных санкцый склала 5,4 тысячы рублёў (што ў 1,9 раза больш, чым у 2019 годзе).

У мінулым годзе прызначылі 80 праверак суб'ектаў гаспадарання, 11 з іх былі выбарачныя, а 69 — запланаваныя. У выніку праверак МАРГ прыпыніў работу 35 гандлёвых аб'ектаў.

«Існуе Палажэнне аб парадку прыпынення работы гандлёвага аб'екта ці аб'екта грамадскага харчавання, у аснову якога пакладзена бальная сістэма ацэнкі парушэнняў, устаноўленых у ходзе праверкі, — тлумачыць **начальнік аддзела каардынацыі кантрольнай дзейнасці Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Кірыл СЛАБКО.** — Вызначаны канкрэтны пералік парушэнняў, кожнаму з якіх прысвоены адпаведны бал. Вядома, асаблівая ўвага — парушэнням, звязаным з цэнаўтварэннем, захаваннем асартыментных пералікаў тавараў, а таксама патрабаванням да бяспекі тавараў. Устаноўлена парогавае значэнне: яго перавышэнне ў выніку падсумоўвання ўсіх балаў, выяўленых у ходзе праверкі, з'яўляецца ўмовай прыпынення работы аб'екта».

Але часцей за ўсё магазіны за парушэнні проста штрафуюць. Так, да адміністрацыйнай адказнасці па розных напрамках кантрольнай дзейнасці службовымі асобамі МАРГа прыцягнуты 923 вінаватыя асобы.

Што датычыцца кантролю цэн, то 199 фактаў невыканання патрабаванняў нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць гэтыя пытанні, устаноўлена МАРГам у 2020 годзе.

«ЗАМАРОЖАНЫЯ» ЦЭННІКІ

З-за сусветнай пандэміі і нягледзячы на складаную сітуацыю ў краіне цэны ў магазінах пачалі паўзці ўверх. Каб забяспечыць беларусаў неабходнымі прадуктамі і лекамі, урад прыняў рашэнне замарозіць цэннікі з 24 лютага. А з сакавіка жорсткі кантроль — рост не болей за 0,2 % у месяц (пастанова Савета Міністраў ад 23 лютага 2021 г. № 100). МАРГ, у сваю чаргу, узмацніў у краіне цэнавы маніторынг.

У фокусе асаблівай увагі сёння сацыяльна значныя тавары, тыя, што мы купляем практычна кожны дзень. І калі ад пакупнікоў падаецца сігнал, што завышана цана ў той ці іншай краме, міністэрства пачынае праверку.

«Сам працэс маніторынгу крыху расцягнуты па часе, таму што аналізуецца ўся інфармацыя, якая паступае і якая звязана з цэнамі, — расказвае Кірыл Слабко. — Даведацца аб тым, з-за чаго цэны на тавары на паліцах крамы павялічыліся, адразу ў прынцыпе немагчыма».

Каб разумець, чаму так адбываецца, трэба ведаць сам працэс фарміравання цаны. Рознічная цана складаецца з цаны пастаўшчыка, а гэта можа быць вытворца або імпарцёр, далей сваю прыбытковасць дадае гандаль, а гэта надбаўка і падатак на дабаўленую вартасць (ПДВ) — апошні элемент рознічнай цаны. Гандлёвыя надбаўкі на прадукты харчавання абмежаваны не больш чым ад 15 да 30 %, калі браць малочныя прадукты, крупы або мяса. Але гэтыя надбаўкі — не проста тое, што гандаль зарабіў і паклаў сабе ў кішэню. Гэта яшчэ і ўсе яго выдаткі на перавозку, захоўванне, фасоўку, зарплаты работнікам і арэнду памяшкання. Сёння ўсе выдаткі, вядома, трэба перагледзець. Але каб быў вынік і цэны не паўзлі ўверх, рамкі патрэбны не толькі аб'ектам рознічнага гандлю, таму прынята рашэнне абмежаваць і гандлёвую надбаўку, і рэнтабельнасць імпарцёраў і вытворцаў.

Галоўнай мэтай такіх абмежаванняў застаецца падтрыманне цэнавай стабільнасці і даступнасці тавараў. Аднак ёсць такія, што беларусы ахвотна купляюць, але ў нашай краіне не вырошчваюць, напрыклад рыс, бананы, цытрусавыя... Альбо вырошчваюць не тымі аб'ёмамі як грэчка, або не ўвесь сезон, як памідоры і агуркі. Вядома, зімой нешта даражэй, чым летам. У мінулым і гэтым гадах на цэнах імпарту адбіваецца сусветнае павышэнне цэн, таму і ў магазінах бачым адпаведныя «кусачыя» лічбы.

«Але, нягледзячы на гэта, мы бачым, што меры міністэрства, меры ўрада даюць вынік, — упэўнены **начальнік аддзела зводнага аналізу і прагназавання аналітычнага ўпраўлення Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Аляксей ЗУБОВІЧ.** — Бачым па лічбах. Калі мы кажам, што ў лютым усе цэны выраслі практычна на 9 %, то, па ацэнцы МАРГ, інфляцыя на сацыяльна значныя тавары склала каля 7 %, гэта значыць, практычна на 2 % менш».

Дарэчы, пасля прынятых мер у лютым па падтрыманні цэнавай стабільнасці на сацыяльна значныя тавары парушэння заканадаўства па росце цэн пакуль няма. Рэгулятар маніторыць усе гандлёвыя сеткі і адпускныя цэны перапрацоўкі. Свайго, беларускага, на паліцах магазінаў большасць. Аб'ёмы вытворчасці сацыяльна значных тавараў перавышаюць патрэбу ўнутранага рынку, таму пакуль гаворкі пра дэфіцыт не будзе.

«Апошнім часам мы назіраем значную актывізацыю экспартных паставак на знешнія рынкі, у тым ліку і сацыяльна значных тавараў, — гаворыць **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Міхаіл ЖЫГАЛА.** — Напрыклад, па яйках курыных экспарт у лютым у параўнанні са студзенем павялічыўся ў паўтара раза, а ў дачыненні да сярэднямесячных паказчыкаў 2020 года — на 26 %. З аднаго боку, можна зразумець нашых айчынных вытворцаў, бо экспарт — гэта валютная выручка і дадатковы прыбытак. Але мы мяркуем, што айчынныя вытворцы павінны несці і ўсведамляць сацыяльную адказнасць перад грамадствам і дзяржавай і забяспечваць пастаўкі на ўнутраны спажывецкі рынак у прыярытэтным парадку».

Абарона нас, пакупнікоў, — гэта і абавязковы асартыментны пералік для гандлю. Дарэчы, яшчэ прынятыя меры ўплываюць і на насычэнне спажывецкага рынку неабходнымі таварамі.

У пералік сацыяльна значных тавараў згодна з пастановай № 100 урада ўвайшлі 62 пазіцыі, сярод якіх рыс, грэчкавая, манная, пярловая, прасяная крупы, куры, малако, кефір, смятана, тварог, яйкі, запалкі і іншае. У пераліку лекавых сродкаў 50 найменняў.

Цэны на гэтыя тавары могуць быць вышэйшыя за ўстаноўленую мяжу толькі па ўзгадненні з Камісіяй па пытаннях дзяржаўнага рэгулявання цэнаўтварэння пры Савеце Міністраў, а за неабгрунтаваныя перакосы ў цэнах будуць штрафаваць.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ЗЛАДЗЕІ ЗА КАМП'ЮТАРАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зламыснікі прыдумляюць усё новыя спосабы махлярства: яны здзяйсняюць званкі ад імя прадстаўнікоў банкаў і пераконваюць грамадзян паведаміць, напрыклад, нумар банкаўскай карткі, код пацвярджэння або ўстанавіць якое-небудзь праграмнае забеспячэнне, каб атрымаць даданы доступ да мабільнага тэлефона. «Такім чынам зламыснікі атрымліваюць практычна ўсе ключы для здзяйснення крадзяжоў», — падкрэсліў начальнік упраўлення.

Лепш мець сутачныя ліміты па плацяжах

Асобна Дзмітрый Дудкоў адзначыў, што сёння кіберзлачыннасць носіць трансгранічны характар. У суседніх з намі краінах, іншых дзяржавах працуюць цэлыя арганізаваныя групоўкі, якія здзяйсняюць крадзяжы грашовых сродкаў у нашых грамадзян.

У першую чаргу праваахоўныя органы рэкамендуюць не перадаваць ніякай інфармацыі, калі вам паступаюць падобныя званкі. Лепш спыніць размову, а калі ёсць сумненні, то самастойна праверыць у інтэрнэт-банкінгу, мабільным дадатку, ці сапраўды маюцца якія-небудзь аперацыі.

Акрамя таго, вы можаце звярнуцца па інфармацыю, скарыстаўшы нумар тэлефона, які пазначаны на афіцыйным сайце банка. Для анлайн-плацяжоў спецыялісты рэкамендуюць мець асобную банкаўскую картку — усё таму, што фіксіраваліся такія выпадкі, калі выкарыстоўвалася зарплатная картка, а пасля ўсе грошы пэўным чынам былі пераведзены на замежны рахунак.

Дарэчы, эксперт звярнуў увагу, што нярэдка ў людзей спісваюцца з рахункаў сапраўды вялікія сумы. Але гэтага можна было пазбегнуць, калі б кліент прарабіў са сваёй карткай адну простую аперацыю.

Каб прадухіліць гэта, дастаткова паставіць нейкія сутачныя ліміты па плацяжах. А калі вы не выкарыстоўваеце картку для анлайн-плацяжоў, спецыялісты таксама рэкамендуюць прыбраць CVV-нумар з адваротнага боку карткі. Дадзенай рэкамендацыяй таксама прапануецца абараніць пажылых людзей ад патэнцыйных пагроз, якія не карыстаюцца анлайн-плацяжамі. Гэта засцеражэ іх і ў выпадку страты кашалька з карткамі.

Пенсіянеры больш даверлівыя

Ужо сёлета ахвярамі кіберзлачынстваў сталі 157 пенсіянераў — жыхароў сталічнага рэгіёна, распавёў **начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі УУС Мінскага аблвыканкама Андрэй БЯРОЗКА.** У сваёй паўсядзённай дзейнасці супрацоўнікі дадзенага ўпраўлення даводзяць да насельніцтва інфармацыю пра спосабы здзяйснення злачынстваў, аб тых мерах прафілактычнага характару, якія неабходна прымаць, каб не стаць ахвярай кіберзлачынцы. Пенсіянеры, пажылыя людзі — найбольш уразлівая катэгорыя. Яны заўсёды ўважліва выслухаюць па тэлефоне незнаёмага ветлівага чалавека, таму яны схільныя да больш лёгкага ўнушэння.

«У сваёй рабоце мы тлумачым людзям, што работнікі службы бяспекі банка ніколі не патэлефануюць ім, выкарыстоўваючы вайбер, не папросяць нумар карткі, не запатрабуюць перавесці грошы куды-небудзь. Аднак усё яшчэ ёсць шмат выпадкаў, калі людзі вераць і пераводзяць сродкі. Гэта сведчыць аб нізкім узроўні прававой свядомасці насельніцтва,

таму наша асноўная задача — данесці, растлумачыць, што рабіць і як сябе паводзіць у такіх сітуацыях. Хачу звярнуць увагу, што ў канцы сакавіка намеснікам прэм'ер-міністра Юрыем Назаравым зацверджаны комплексны план па прафілактыцы гэтага віду злачынстваў, які мы будзем выконваць з прыцягненнем усіх суб'ектаў прафілактыкі. Гэта ўстановы адукацыі, сацыяльныя і камунальныя службы, дзе будзем працаваць з імі шляхам размяшчэння інфармацыі на квітанцыях аб аплаце камунальных паслуг, каб людзі чыталі, бачылі, ведалі», — адзначыў Андрэй Бярозка.

Таксама спецыяліст адзначыў, што вядзецца прафілактычная работа сярод маладога пакалення. Яны павінны ведаць, што за занятак вішынгам можна трапіць у турму. «Мы выступаем перад непаўналетнімі ў навучальных установах, даводзім ім інфармацыю аб узросце, з якога наступае крымінальная адказнасць. Яны павінны разумець, што пачынаючы з 14-гадовага ўзросту ў выпадку, калі яны пераступяць рысу, могуць несці ўстаноўленую законам адказнасць», — нагадаў праваахоўнік.

Акрамя таго, бестурботнасць грамадзян, якія не ўстанаўліваюць антывірусы, выкарыстоўваюць усюды аднолькавыя паролі, прыводзіць да таго, што зламыснікі праз шкоднае праграмнае забеспячэнне завалодваюць лагінам і паролем. Эксперты-крыміналісты рэкамендуюць устанаўліваць розныя паролі ў сацыяльных сетках і інтэрнэт-банкінгу, а таксама не захоўваць іх у браўзеры.

Акрамя таго, не трэба пераходзіць па спасылках, якія вам прапануюць наведаць у рассылках. Праз іх могуць устанаўлівацца шкодныя праграмы, якія перахопліваюць не толькі паролі, але і файлы.

Пераканаць можна любога?

Сёння ўсё часцей з'яўляюцца новыя схемы ашуканскіх дзеянняў з выкарыстаннем мабільных тэхналогій, інтэрнэт-банкінгу. Такія злачынцы віртуальнай сферы паспяхова выкарыстоўваюць розныя гандлёвыя пляцоўкі, дзе пры дапамозе атрыманых асабістых даных грамадзян здзяйсняюць крадзеж грашовых сродкаў.

«Калі мы апусцім тэхнічны аспект, то застаецца такая форма класічнага махлярства, як пераканне. Пераканне і ветлівасць пры тэлефонных размовах у спалучэнні з фактарамі бестурботнасці і залішняй даверлівасці дазваляюць злачынцам атрымліваць асабістыя звесткі пацярпелых, якія пасля паспяхова выкарыстоўваюцца ў ашуканскіх схемах», — адзначыў **намеснік начальніка УУС Мінскага аблвыканкама — начальнік крымінальнай міліцыі Аляксандр КОПІШАЎ.**

Пацярпелыя — прадстаўнікі цалкам розных узроставых груп, сацыяльнага статусу і ўзроўню адукацыі. Сёння практычна ўсе пласты нашага насельніцтва могуць быць пацярпелымі ад гэтай злачыннай дзейнасці, усе, хто карыстаецца мабільным тэлефонам і інтэрнэтам.

Спецыялісты прыгадалі некалькі тыповых выпадкаў вішынгу. Жыхару Маладзечанскага раёна патэлефанавалі нібыта са службы бяспекі вядомага банка. У ходзе размовы ён паведаміў ашуканцу асабістыя даныя, нумар карты і афоршу на сваё імя анлайн-крэдыт. Сума ў памеры 8 тысяч рублёў сышла на рахунак замежнага банка, а мужчына вымушаны цяпер пагашаць доўг. Другі выпадак — жыхарку Мінскага раёна падчас размовы злачынец угаварыў «блакіраваць картку, а потым перавесці грошы на бяспечны рахунак». Дзяўчына па ўказцы ўстанавіла шкодны дадатак на мабільны тэлефон, з дапамогай якога былі выкрадзены сродкі ў памеры 19 тысяч рублёў.

Сяргей КУРКАЧ.

Дзяржава і бізнес

САМАЯ МАШТАБНАЯ ПЛЯЦОЎКА

VI Тыдзень беларускага прадпрымальніцтва праводзіцца пры падтрымцы ўрада

VI Тыдзень прадпрымальніцтва праходзіць у нашай краіне з 19 да 25 красавіка. Ён уключаны ў Дзяржаўную праграму развіцця малога і сярэдняга бізнесу на 2021—2025 гады. Пра гэта паведаміў **старшыня Вышэйшага каардынацыйнага савета Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Андрэй КАПЫТОК.**

Тыдзень прымеркаваны да 30-годдзя пачатку фарміравання прыватнага сектара эканомікі Беларусі і 30-годдзя прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце краіны. Паводле слоў кіраўніка Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, арганізатары пераканаць ў яго пазітыўнай ролі як самай значнай і маштабнай дыялогавай пляцоўкі для абмеркавання праблем і перспектыў прадпрымальніцтва. Акрамя таго, ён будзе спрыяць павышэнню канструктыўнай ролі бізнесу ў росце эканамічнага патэнцыялу развіцця Беларусі і рэгіёнаў, сацыяльнай адказнасці.

Дыялог паміж бізнесам і ўладай у Беларусі павінен стаць больш інтэнсіўным. Такое пажаданне выказалі больш за палову прадпрымальнікаў, якія ўзялі ўдзел у апытанні па ацэнцы індэкса дзелавога аптымізму.

Сёлета апытанне было самае маштабнае на пытанні адказалі прадстаўнікі звыш 21 тысячы прадпрыемстваў і кампаній. Адна з галоўных тэм — работа бізнесу ў пандэмію, калі граніцы партнёраў у суседніх краінах закрыты. Падчас Тыдня прадпрымальніцтва дадзеную тэму абмеркавалі на ўсіх пляцоўках.

Асноўнай падзеяй стаў III Рэспубліканскі дзелавы форум «Развіццё прадпрымальніцтва ў Беларусі: Стратэгія. Прыярытэт. Перспектывы кансалідацыі».

Падчас форуму таксама адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Найлепшы горад (раён) і вобласць для бізнесу Беларусі — 2020». Імі сталі рэгіёны краіны з найбольш развітой дзелавой актыўнасцю і самымі спрыяльнымі ўмовамі для развіцця прадпрымальніцтва. У конкурсе ўдзельнічаў 141 рэгіён.

Андрэй Капыток звярнуў увагу на тое, што прыватны сектар эканомікі краіны зараз здольны сфарміраваць новыя пункты эканамічнага росту. На 1 студзеня гэтага года, паводле звестак Белстата і МПЗ, сваю дзейнасць ажыццяўляла 373 тысячы суб'ектаў гаспадарання, што больш, чым на аналагічную дату 2020 года, практычна на 10 тысяч суб'ектаў. Гэтая станоўчая дынаміка характэрна на фоне негатыўных з'яў, выкліканых каранавіруснай інфекцыяй.

У сваю чаргу, **старшыня Саюза некамерцыйных арганізацый «Канфедэрацыя прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў» Анатоль ХАРЛАП** адзначыў, што пачаўся працэс змены структуры прыватнага бізнесу і рух прыватнага капіталу ў бок прамысловага сектара. А **генеральны дырэктар Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў Пётр АРУШАНЬЯНЦ** падкрэсліў, што тэма вытворчай кааперацыі бізнесу сёння становіцца адным з найбольш цікавых пытанняў.

— Выключна дзякуючы вытворчай кааперацыі прыватнага і дзяржаўнага бізнесу можна зрабіць больш танны і канкурэнтаздольны прадукт з пункту гледжання тэхнічнага і экспартнага патэнцыялу. Аднак гэтая магчымасць не выкарыстоўваецца сёння так, як магла б. Беларускі фонд фінансавай падтрымкі далучыўся да праграмы імпартазамяшчэння. Праз тыдзень пройдзе першая кантактна-кааперацыйная біржа, звязаная з пытаннямі імпартазамяшчэння, дзе будзе магчымасць для прыватнага бізнесу абмеркаваць пастаўкі на буйныя вытворчыя прадпрыемствы МАЗ, МТЗ, — заявіў кіраўнік фонду.

Падчас форуму **першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО** нагадаў, што за мінулы год сфарміраваліся нечаканыя выклікі перад бюджэтам, эканомікай і прадпрымальніцтвам. Адзін з іх — пандэмія, якая закранула кожнага ўдзельніка эканамічных адносін.

У сваю чаргу, **намеснік міністра па падатках і зборах Ігар СКРЫННІКАЎ** паведаміў, што ў МПЗ працягнуць ствараць празрыстыя і простыя ўмовы для выканання падатковых абавязацельстваў.

Намеснік міністра эканомікі Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ на форуме падкрэсліў, што дзяржава на працягу многіх гадоў прытрымліваецца курсу на стварэнне ўмоў для актывізацыі прадпрымальніцкай ініцыятывы і зацікаўлена ў тым, каб уклад бізнесу ў развіццё эканомікі ўзрастаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Ну і ну!

Падманула на 157 тысяч рублёў

Сярод пацярпелых — муж, свёкар, суседзі

Летась у 42-гадовай жыхаркі райцэнтра пагоршылася матэрыяльнае становішча: зарплата паменшылася, цалкам выплачваць крэдыты не атрымлівалася. Падрабязнасці гэтай крэдытнай афёры паведамляе МУС.

Жанчына звярнулася па дапамогу ў мікрафінансавую арганізацыю. Даць грошы «пад працэнты» там не пагадзіліся, але прапанавалі іншы варыянт — у салоне сувязі аформіць растэрміноўку на смартфон за чатыры тысячы рублёў і перадаць яго крэдыторам узамен на неабходныя ёй дзве тысячы рублёў. Кліентка пагадзілася.

Нягледзячы на даўгі перад банкамі, ёй адобрылі растэрміноўку. Гаджэт тут жа быў прададзены прадстаўнікам «хуткіх грошай». Жанчына аплаціла частку старых пазык, астатняе выдаткавала. Рублі хутка скончыліся, і мазыранка зноў пайшла ў салон сувязі, праўда, ужо з пашпартам мужа і ўпотай ад яго. Гісторыя пра пастаянную занятасць мужа на рабоце і вострую неабходнасць дарагога гаджэта для сям'і спрацавала: прадавец у парушэнне інструкцый аформіла яшчэ адну растэрміноўку — банк адобрыў.

У выніку па пашпарце мужа былі зроблены яшчэ пяць пакупак (смартфон, разумны гадзіннік, навушнікі і інш.) з наступнай рэалізацыяй тым жа прадстаўнікам мікрафінансавай арганізацыі. Пасля гэтага менеджар салона сувязі перастала абслугоўваць жанчыну і скіравала кліентку да сваёй калегі. Тая неколькі разоў прадала гаджэты па пашпарце свёкра жанчыны, аднак і гэты дакумент быў лімітаваны для растэрміновак.

Тым не менш гараджанка не спынілася і пайшла да суседзяў. На гэты раз як кантралёр дзяржарганізацыі. Людзі ведалі яе і таму не здзівіліся, калі іх папрасілі даць пашпартныя даныя нібыта для перазаключэння дагавора на паслугі.

Канвеер крэдытаў і продажаў гаджэтаў за паўцаны існаваў з сакавіка да лістапада мінулага года. Афёру перапыніў муж жанчыны, калі яму адмовілі ў пазыцы, спаслаўшыся на «дрэнную крэдытную гісторыю». Мужчына звярнуўся ў міліцыю, а тая раскруціла злачынны ланцужок.

Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням кліенткі салона і яго менеджарам. Заведзена крымінальная справа за махлярства ў асабліва буйным памеры.

Пакуль вядома пра 54 крэдытныя дагаворы, афармленыя на 17 чалавек, і шкодзе на 157 тысяч рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БТА БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2021 г.

Наименование банка: ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	01.04.2021	01.01.2021
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	12 191	10 372
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	38 722	37 834
5	Средства в банках	1104	28 035	40 633
6	Ценные бумаги	1105	75 044	74 358
7	Кредиты клиентам	1106	247 329	258 453
8	Производные финансовые активы	1107	-	4
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	12 079	11 542
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	788	791
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	1 068	195
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	1 139	1 423
15	ИТОГО активы	11	416 395	435 605
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
17	Средства Национального банка	1201	8 238	-
18	Средства банков	1202	47 865	68 564
19	Средства клиентов	1203	288 372	299 418
20	Ценные бумаги банка	1204	19 840	15 524
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	2
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	869	1 088
24	ВСЕГО обязательства	120	365 184	384 596
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
26	Уставный фонд	1211	24 747	24 747
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	1 462	1 378
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	9 369	9 372
30	Накопленная прибыль	1215	15 633	15 512
31	ВСЕГО собственный капитал	121	51 211	51 009
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	416 395	435 605

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2021 г.

Наименование банка: ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	01.04.2021	01.04.2020
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	7 970	6 449
2	Процентные расходы	2012	5 681	3 775
3	Чистые процентные доходы	201	2 289	2 674
4	Комиссионные доходы	2021	1 622	1 501
5	Комиссионные расходы	2022	382	212
6	Чистые комиссионные доходы	202	1 240	1 289
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(129)	7
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	1 287	749
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(314)	158
11	Чистые отчисления в резервы	207	1 014	1 136
12	Прочие доходы	208	255	102
13	Операционные расходы	209	3 225	3 371
14	Прочие расходы	210	187	194
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	202	278
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	1	10
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	201	268

Председатель Правления А. В. Доронкевич

Главный бухгалтер Т. Н. Ковалева

Дата подписания: 2 апреля 2021 г.

УНП 807000071

Фирменное наименование эмитента
(полное наименование, включая организационно-правовую форму)

Открытое акционерное общество «Строммаш»

Местонахождение эмитента (индекс, почтовый адрес, телефон, факс):
220036, г. Минск, Бетонный проезд, 6, комн. 309, тел./факс 272-76-06
Учетный номер плательщика (УНП): 100148677

Информация об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 01 января 2021 г.

4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %)		99,34
Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде, %
республиканская	2 092 600	99,4252

5-6. Информация о дивидендах и акциях

Показатель	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	159	136
в том числе: юридических лиц	лиц	1	1
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц		
в том числе: физических лиц	лиц	158	135
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц		
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей		
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тысяч рублей		
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей		
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___	рублей		
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___	рублей		
Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей		
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___	рублей		
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___	рублей		
Период, за который выплачивались дивиденды	месяц, квартал, год		X
Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов	число, месяц, год		X
Срок (сроки) выплаты дивидендов	число, месяц, год		X
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей		
Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего	штук		

7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества

Производство строительных металлических конструкций и их частей	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	2908,00	2457,00
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	тысяч рублей	3003,00	2430,00
Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода)	тысяч рублей	-208,00	-60,00
в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	-95,00	27,00
прочие доходы и расходы по текущей деятельности	тысяч рублей	-113,00	-86,00
прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	тысяч рублей		-1,00
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	тысяч рублей		8,00
Чистая прибыль (убыток)	тысяч рублей	-208,00	-68,00
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	тысяч рублей	-1524,00	-1316,00
Долгосрочная дебиторская задолженность	тысяч рублей		
Долгосрочные обязательства	тысяч рублей		
8. Среднесписочная численность работающих	человек	101	111

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **производство строительных металлических конструкций и их частей.**

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утвержден годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **29 марта 2021 г.**
Дата подготовки аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности: **23.03.2021 г.**
Наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождение (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: **ЧП «Бухгард», г. Минск, пер. С. Ковалевской, д. 63, комн. 203. Дата госуд. регистрации 26.08.2014 г., свидетельство о регистрации № 0071365.**
Период, за который проводился аудит: **2020 г.**
Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях: прилагаемая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Строммаш» по состоянию на 31 декабря 2020 года, финансовые результаты ее деятельности и изменение ее финансового положения, в том числе, движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: 23.04.2021 г. ЕПФР.
11. Дата и источник опубликования (размещения) годового отчета эмитента открытого акционерного общества за отчетный год (только в составе годового отчета):

Дата опубликования	Место опубликования
23.04.2021 г.	ЕПФР
	сайт эмитента
	сайт центрального депозитария

13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): **не применяется.**
14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети интернет: **www.strommashm.by.**

Руководитель О.Е. Лашкевич
Главный бухгалтер
либо руководитель организации
или индивидуальный предприниматель,
оказывающие эмитенту услуги
по ведению бухгалтерского учета
и составлению бухгалтерской
и (или) финансовой отчетности С.Л. Баландинь

Лицо, ответственное за подготовку отчета,
инженер по нормированию М. М. Хомичук
тел. 356-75-13.

31 марта 2021 г.

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 05 мая 2021 г. в 11.00 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 80 % после вторых несостоявшихся торгов по продаже объекта недвижимости – здания склада КРС с инв. № 311/С-31686, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гомельхлебопродукт» на праве собственности

Состав лота № 1:
Здание склада КРС, инв. №311/С-31686. Адрес: Гомельская обл., Добрушский р-н, Утевский с/с, п. Степь. Назначение: здание специализированное складов. Одноэтажное кирпичное строение. Общая площадь — 935,0 кв. м. Составные части и принадлежности: три гаража, склад

Начальная цена лота: 8 784,00 рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 800,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

***Земельный участок** для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **2,6400 га** с кадастровым номером 321287202102000098. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь*

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул.Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 04 мая 2021 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 **05 мая 2021 г**.
Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 23.04.2021 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта.
Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.
Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» № 23 от 06.02.2021 г., № 49 от 17.03.2021 г.

Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47. сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by
Продавец: Филиал «Новобелицкий КХП» ОАО «Гомельхлебопродукт», г. Гомель, ул. Кореневское шоссе, 4. тел.: 8 (0232) 27-07-36, 28-21-47, 8 (029) 102-27-13.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY
Продавец: **ОАО «Лоевский КБО»** (УНН 400028996) 247095, Гомельская обл., г. п. Лоев, ул. Ленина, 24а, Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.
Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **07 мая 2021 г. 09.00-17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Автомобиль IZH 27175, VIN: Z9Z271750C0033764, рег. № АІ 4595-3, тип ТС - грузовой фургон, тип двигателя — бензиновый, 6-ст. МКПП, колесная формула 4х2, 2012 г. в., г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77	2700,00
2	Капитальное строение инв. №340/С-314434, пл. 471,6 кв. м (здание столярного цеха), Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А	9620,00
3	Капитальное строение, инв. №340/С-314435, пл. 41,5 кв. м, здание склада сырья и материалов, Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А/1	800,00
4	1. Капитальное строение, инв. № 340/С-315568, пл. 127,0 кв. м (здание пилорамы), Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А/2. 2. Пилорама Р63. Оборудование конвейера в комплекте к раме РПМО-02М, 2005 (2013) г. в., инв. № 2278. 3. Заточной станок, г. в. н/у, инв. № б/н	13536,00
5	Капитальное строение с инв. № 340/С-313948, пл. 140,9 кв. м, здание комплексно-приемного пункта. Составные части и принадлежности: терраса, крыльцо. Гомельская обл., Лоевский р-н, Бывальковский с/с, д. Бывальки, ул. Ермакова Ф. А., 17	8010,00

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.
Для участия в торгах необходимо в срок с 24.04.2021 г. 09.00 по 06.05.2021 г. 17.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 07.04.2021 г.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
23 красавіка 2021 г. № 15 (600)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АДЗІН ДЗЕНЬ У ПАРЛАМЕНЦЕ

«Каманда будучага» прымерылася да ролі сенатараў

З пераможцамі адмысловага конкурсу, які арганізаваў Маладзёжны парламент, сустрэлася старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА

Ганна Казлова з Віцебска, Андрэй Будэйка з Гомеля і мінчанка Настасся Рэуцкая правялі рабочы дзень у Савеце Рэспублікі. Такую магчымасць маладыя людзі атрымалі як пераможцы нацыянальнага праекта «Каманда будучага». Гэты конкурс скіраваны на пошук, развіццё і падтрымку перспектыўных лідараў, якія валодаюць высокім узроўнем асобасных якасцяў і кампетэнцый кіраўніка.

Дарэчы, ідэя правядзення гэтага конкурса была агучана на шостым Усебеларускім народным сходзе.

Падчас сустрэчы са спікерам верхняй палаты парламента Наталляй Качанавай маладыя людзі даведаліся пра яе рабочы графік, паўдзельнічалі ў пасяджэнні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы і сацыяльным развіцці, пазнаёміліся з тым, як разглядаюцца законапраекты падчас пасяджэння сесіі.

— Зараз у нас сесійны перыяд — гэта работа над законапраектамі, — растлумачыла спікер верхняй палаты парламента. — І яны вельмі важныя: закон аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму, ахове персанальных даных і іншыя — тое, што падказала жыццё. Гэта вельмі актуальныя пытанні, пра якія яшчэ ўчора не маглі і падумаць. Таму мы павінны працаваць на апераджэнне.

Яна паясніла, што разгляд законапраектаў у Савеце Рэспублікі — гэта ўжо фінішны этап, напярэдадні якога сенатары працавалі разам з парламентарыямі, нават не абышлося без дэбатаў.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

РАЗАМ

АЛЕЯ «НАРОДНАЕ АДЗІНСТВА»

Рукі, жаданне і старанне да стварэння алеі прыклалі спікер верхняй палаты Парламента Наталля Качанава, старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі і работнікі сакратарыята палаты. Як паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, да сенатараў далучыліся прадстаўнікі адміністрацыі Маскоўскага раёна і некаторых яго прадпрыемстваў, на дапамогу прыйшлі і жыхары суседніх вуліц. Разам на плошчы Багушэвіча падчас рэспубліканскага суботніка яны заклалі алею «Народнае адзінства».

На думку Наталлі Качанавай, калектыўная праца аб'ядноўвае людзей. Іх тут бачыш радасных, вясёлых, працуючых з задавальненнем. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла думку аб тым, як важна нам усім быць разам, бо толькі так мы здольны захаваць прыгожую, утульную, камфортную краіну для дзяцей, унукаў, для наступных пакаленняў. А суботнік — цудоўная магчымасць зрабіць свой унёсак у добраўпарадкаванне краіны.

Фота БелТА.

(Заканчэнне на 17-й стар.)

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

Распаўсюджванне звестак: не ўсе мэты бяскрыўдныя

Сенатары на пасяджэнні сесіі Савета Рэспублікі ўхвалілі законапраект аб ахове персанальных даных

Ён мае на мэце забяспечыць абарону правоў і свабод грамадзян пры зборы, апрацоўцы, распаўсюджванні або даванні іх персанальных даных.

— Да сённяшняга часу ў нас не было такога комплекснага закона, — растлумачыў у размове з журналістамі **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім ІПАТАЎ.** — Цяпер такі сістэмны, комплексны акт у нас у краіне з'явіцца і расставіць усе кропкі над «і» ў пытаннях рэгулявання сферы персанальных даных.

Дарэчы, аналагічныя законы існуюць у многіх краінах, у тым ліку ў Расіі, Казахстане, Украіне, Малдове і іншых.

Фота БелТА.

— Цяпер мы падышлі да гэтага пытання, і прававое поле будзе зразумелае. Прычым гэта прававое поле ствараецца з улікам міжнародных актаў, — падкрэсліў Вадзім Іпатаў. — Упаўнаважаны орган па ахове персанальных даных будзе вызначацца кіраўніком дзяржавы. У адпаведным артыкуле закона сказана, што гэты орган з'яўляецца незалежным. На яго не могуць накладацца нейкія іншыя функцыі, акрамя аховы персанальных даных. І другое, яго галоўныя функцыі ўжо закладзены ў законе.

Як паясніў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы і сацыяльным развіцці Андрэй ІВАНЕЦ,** праектам закона прадугледжваецца вызначэнне агульнага паняцця і катэгорый персанальных даных, прынцыпаў і ўмоў работы з імі. У прыватнасці, прадугледжваецца падзел персанальных даных на агульнадасягальныя і спецыяльныя — і, адпаведна, вызначаюцца асаблівасці работы з імі, механізмы збору і давання гэтых даных.

— Базавай умовай выканання якіх-небудзь дзеянняў з персанальнымі данымі будзе з'яўляцца атрыманне свабоднага, адназначнага, інфармаванага выказвання згоды суб'екта персанальных даных на іх апрацоўку, — падкрэсліў ён.

У той жа час у законапраекце вызначаны ралік выпадкаў, калі апрацоўка персанальных даных будзе ажыццяўляцца без згоды іх уладальніка. Напрыклад, падчас адміністрацыйнага ці крымінальнага працэсу, выканання аператыўна-пошукавай дзейнасці, судовых пастаноў і гэтак далей.

Трэба сказаць, што законапраектам вызначаецца і адказнасць за парушэнне заканадаўства аб персанальных даных. Праектам закона непасрэдна замацоўваецца магчымасць кампенсацыі маральнай шкоды, якая была нанесена суб'екту персанальных даных у выніку парушэння яго правоў. Кампенсацыя маральнай шкоды будзе ажыццяўляцца незалежна ад пакрыцця маёмаснай шкоды і панесеных уладальнікам персанальных даных выдаткаў.

Распрацоўшчыкі закона перакананыя, што прыняцце згаданага законапраекта дазволіць забяспечыць неабходны ўзровень аховы персанальных даных.

(Заканчэнне на 17-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Адказы на пытанні

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ правёў «прамую тэлефонную лінію».

Грамадзяне ўзнімалі пытанні аховы навакольнага асяроддзя, зямельных адносін, паляпшэння жыллёвых умоў, праваахоўнай дзейнасці, працоўных адносін і іншыя.

Міхаіл Русы даў вычарпальныя тлумачэнні. Звароты, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, узяты на кантроль і будуць накіраваны для разгляду ў адпаведныя кампетэнтныя дзяржаўныя органы.

Растлумачылі змены ў заканадаўстве

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Брэсцкай абласной калегіі адвакатаў Тамара ШАТЛІКАВА выступіла арганізатарам і прыняла ўдзел у семінары «Новае ў заканадаўстве аб адміністрацыйных правапарушэннях».

На мерапрыемства былі запрошаны старшыні сельскіх Саветаў дэпутатаў, кіраўнікі аддзелаў райвыканкама, юрыдычнай і дадатковай службаў. Семінар адбыўся на базе Маларыцкага раённага выканкама. Дакладчыкамі па асноўных пытаннях выступілі прадстаўнікі абласной калегіі адвакатаў. У ходзе семінара разгледзелі праблемныя моманты, якія ўзнікаюць у працэсе правапрымяняльнай практыкі асобных артыкулаў новай рэдакцыі КоАП.

Рост цэн пад кантролем

Як вядома, з 1 сакавіка ўрадам уведзена рэгуляванне росту цэн на сацыяльна значныя тавары (не больш за 0,2 працэнта ў месяц). Павышэнне звыш устаноўленай мяжы дапускаецца толькі па ўзгадненні з Камісіяй па пытаннях дзяржаўнага рэгулявання цэнаўтварэння пры Савеце Міністраў.

Вынікі маніторынгу, праведзенага членамі Савета Рэспублікі, у тым ліку і сенатарам Андрэем ШЫШКІНЫМ, ва ўсіх рэгіёнах краіны сведчаць аб тым, што дадзенае рэгуляванне апраўдана. Засталіся на ранейшым узроўні або практычна не змяніліся цэны на хлеб, ялавічыну, свініну бяскосную, каўбасныя вырабы, кур, яйка курынае, рыбу (жывую), сыры (цвёрдыя, паўцвёрдыя), сухія малочныя сумесі для дзіцячага і дыетычнага харчавання, тварог, соль, чай чорны, смятану, кефір, алей сланечнікавы, малако, памідоры, бульбу, муку пшанічную і іншыя тавары.

Разам з тым у асобных рэгіёнах і гандлёвых сетках выяўлены факты значнага (ад 10 працэнтаў і больш) росту цэн на буракі, моркву, лук рэпчаты, бульбу, яйка курынае, свініну, рыс, свежыя яблыкі, рыбу марожаную. Прычыны такога росту вывучаюцца, будуць прыняты неабходныя меры.

Марафон добрых спраў

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Барысаўскага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў Алена ЗЯБЛІКАВА ўдзельнічала ў дыялогавай пляцоўцы па тэме рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў у раёне.

Дыскусія адбылася на базе сярэдняй школы № 25 Барысава. Сустрэча прайшла ў рамках конкурсу праектаў «Прафсаюзны рух — 2020». Галоўная ўмова ўдзелу ў конкурсе — наяўнасць ва ўдзельнікаў або распрацоўка імі грамадска карысных ініцыятыў і жаданне іх рэалізаваць. Маладыя людзі сваімі праектамі пацвердзілі, што яны могуць і хочуць зрабіць родны край прыгажэйшым.

Як адзначыла Алена Зяблікава, гэтым мерапрыемствам дадзены старт «марафону добрых спраў» на Барысаўшчыне.

Свята алімпійскіх дзён

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, начальнік Гомельскай мытні і адначасова старшыня Гомельскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Беларускі цяжкаатлетычны саюз» Фелікс ЯШКОЎ удзельнічаў у цырымоніі адкрыцця алімпійскіх дзён моладзі па цяжкай атлетыцы сярод юнакоў і дзяўчат.

Мерапрыемства адбылося на базе Спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву прафсаюзнай арганізацыі Гомсельмаша. У прывітальным слове Фелікс Яшкоў выказаў надзею на тое, што ў найбліжэйшай будучыні ўдзельнікам дзён скорацца і алімпійскія вяршыні, бо развіццё спорту і фізічнай культуры ў Беларусі з'яўляецца адным з важных кірункаў дзяржаўнай палітыкі і значна ўплывае на здароўе нацыі і імідж краіны.

«Каманда будучага» прымерылася да ролі сенатараў

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Таксама спікер верхняй палаты парламента акцэнтавала ўвагу на тым, што сенатары вельмі цесна працуюць з моладдзю, таму што імкнуцца дастукацца да кожнага.

— Трэба ўмець цаніць тое, чаго дасягнула наша краіна, захаваць яе суверэнітэт і перадаць здабыткі будучым пакаленням, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Вернемся да правядзення конкурсу, які дазволіў маладым людзям адчуць сябе ў ролі сенатараў: ён мае на ўвазе фарміраванне ва ўдзельнікаў кампетэнцый у галіне кіравання, у тым ліку праз навучанне, стварэнне камунікацыйнай пляцоўкі для абмену вопытам паміж удзельнікамі і распаўсюджванне найлепшых практык.

Нагадаем, што з 11 да 26 сакавіка праходзіў конкурс па кірунку «Палітыка», вынікі якога былі падведзены ў межах першага Беларускага маладзёжнага парламенцкага форуму. Паўдзельнічаць у конкурсе маглі маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 31 года, якія жывуць у Беларусі і маюць вопыт грамадскай дзейнасці. Заахвочаныя праходзілі анлайн-рэгістрацыю на сайце Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе і скіроўвалі свой аўтарскі праект на тэму фарміравання базы і работы з маладымі палітычнымі лідарамі нашай краіны.

Да ўдзелу на першым этапе былі дапушчаны праекты, што рэалізоўваюцца ў цяперашні час ці толькі плануюцца да рэалізацыі. Такім чынам, на першым этапе было пададзена каля ста праектаў, з якіх да ўдзелу ў пяўфінал прайшлі 40 ідэй. Наступны этап быў арганізаваны ў афлайн-фармаце, падчас яго арганізатары выбралі 15 фіналістаў. Ідэі канкурсантаў на гэтым этапе разглядаў экспертны савет з ліку членаў Савета Рэспублікі, прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і грамадскасці. Па выніках комплекснай ацэнкі экспертным саветам былі вызначаны тры пераможцы этапу «Палітыка». Так, студэнтка Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Настасся Рэуцкая прапанавала да рэалізацыі праект па навучанні аратарскаму майстэрству маладых лідараў, студэнтка Віцебскага медуніверсітэта Ганна Казлова — праект «Беларусь без межаў», дзе беларуская моладзь расказвае замежным аднагодкам пра сваю краіну, яе дасягненні і здабыткі (своеасаблівы маўленчы клуб) і кіраўнік псіхалагічнага інтэграванага тэатра МО/ON Андрэй Будэйка — праект школы інклюзіўнага лідарства.

На конкурсе ўдзельнікі выконвалі заданні і праходзілі комплексную ацэнку агульных ведаў, інтэлектуальных здольнасцяў, кіраўнічага патэнцыялу, лідарскіх якасцяў і прафесійных кампетэнцый (падрыхтоўка праекта па зададзенай тэматыцы, тэсціраванне, праходжанне інтэрв'ю, прэзентацыя праекта і іншыя).

Адзначым, што аналагічныя конкурсныя адборы павінны прайсці па ўсіх кірунках дзейнасці: наступны этап ахопіць сферу медыцыны.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ПАЕХАЛІ!

КАЛІ БЕЛАРУСЬ, ТО ГАСЦІННАЯ,

або Турызм на новым узроўні

На пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў сярод іншага зацвердзілі рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Беларусь гасцінная» на 2021—2025 гады.

postim.by

Начальнік упраўлення спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама Васіль ЗАХАРЭВІЧ растлумачыў, што праграма скіравана на фарміраванне і развіццё сучаснага канкурэнтаздольнага турыстычнага комплексу, павелічэнне ўкладу турызму ў нацыянальную эканоміку. У якасці прыярытэтаў вызначаны: развіццё ўязнога і ўнутранага турызму, павышэнне канкурэнтаздольнасці адпаведных паслуг і прасоўванне нацыянальных турыстычных брэндаў на сусветным рынку.

У складзе праграмы — тры падпраграмы: «Кадравае і вучэбна-метадычнае забеспячэнне ў сферы турызму», «Маркетынг турыстычных паслуг», «Развіццё аб'ектаў турыстычнай індустрыі». Таксама прадугледжаны распрацоўка і абнаўленне экскурсій і тураў, у тым ліку віртуальных, аўдыягідаў, трансгранічных турыстычных маршрутаў. Не забудуць і пра маршруты для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Тым больш што колькасць вандроўнікаў штогод павялічваецца.

У Віцебскай вобласці нямала мясцін, якія абавязкова раяць наведаць. Нават цяжка адразу назваць найбольш цікавыя. У абласным цэнтры ёсць шмат цікавых месцаў, звязаных з імем сусветна вядомага мастака Марка Шагала: дом, арт-цэнтр, дзе прадстаўлена яго графіка; будынак, дзе ён працаваў разам з такімі знакамітасцямі, як Казімір Малевіч, Эль Лісіцкі, Вера Ермалаева, Давід Якерсон і іншымі... А недалёка ад Віцебска — вядомы музей-сядзіба «Здраўнёва», дзе жыў з сям'ёй вялікі рускі жывапісец Ілья Рэпін. Там ён стварыў шмат вядомых палотнаў... Сафійскі сабор у Полацку — адна з архітэктурных жамчужын Беларусі, помнік дойлідства XI—XVIII стагоддзяў, старажытнае культавае каменнае збудаванне, створанае ў візантыйскім стылі. Безумоўна, яго трэба ўбачыць.

Шмат духоўна-гістарычных і архітэктурных адметнасцяў у старажытнай Оршы. Гэта комплекс езуіцкага калегіума, помнік архітэктуры XVII стагоддзя ў стылі барока і Куцеінскі манастыр, вядомы як адзін з найбуйнейшых цэнтраў кнігадрукавання. Менавіта ў друкарні гэтага манастыра беларускім друкаром і асветнікам Спірыдонам Собалем у 1631 годзе быў выдадзены першы «Буквар»... Словам, у кожным раёне вобласці ёсць нешта вартае ўвагі. Турызм на любы густ прапануецца патэнцыйным гасцям Прыдзвіння: паломніцкі, аздараўленчы, экалагічны, паляўнічы, адукацыйны, гастранамічны і іншыя віды.

Ёсць магчымасць і зарабляць на турызме. На сайце Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта можна ўбачыць пералік зямельных участкаў, прапанаваных для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у дадзенай сферы — даволі, між іншым, прыбытковай, калі знайсці ўласную «фішку».

У прыватнасці, у зоне адпачынку на возеры Сосна ў вёсцы Доўжа Віцебскага раёна, дзе вельмі любяць адпачываць віцябляне, прапануецца аказваць турыстычныя паслугі для кемпераў і каравананінгаў. Дарэчы, такія «дамы на колах» усё больш у трэндзе, таму і чакаецца вялікая зацікаўленасць з боку інвестараў у развіцці інфраструктуры. Наконт кемперных стаянак — запатрабаваныя яны ў Шумілінскім, Ушацкім, Пастаўскім і іншых раёнах. На сёння ж такіх аб'ектаў у вобласці ўсяго некалькі: два — ва Ушацкім раёне, адзін — у Віцебскім.

У Гарадоцкім раёне, недалёка ад граніцы з Расіяй, ёсць магчымасць стаць гаспадаром недабудаванага санаторыя больш чым на 230 месцаў. У ім трохпавярховы спальны і лячэбна-дыягнастычны карпусы, сховішча для гародніны. Тут прадугледжана стварэнне базы адпачынку з арганізацыяй паляўнічых тураў, дома адпачынку і ажыццяўленне іншых варыянтаў вытворчай, турыстычна-аздараўленчай дзейнасці.

А недалёка ад возера Лосвіда мясцовая ўлада гатовая дапамагчы ў будаўніцтве гольф-клуба з дамамі для адпачынку і пражывання да двухсот чалавек, гасцініцы на пяцьдзясят нумароў. А пляцоўка для навучання дзяцей гульні ў гольф, безумоўна, стане нагодай для цікавага сямейнага тура.

Ахвотным распачаць сваю справу ў галіне сельскага турызму ўлада можа дапамагчы і грашыма. Маецца на ўвазе фінансавая падтрымка ў выглядзе выдзялення субсідый, якая аказваецца беспрацоўным. Ёсць і спецыяльная банкаўская праграма крэдытавання ўладальнікаў сядзіб. Ужо больш за 600 такіх турыстычных пунктаў гасцінна прымае турыстаў з розных краін.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Сядзі і глядзі

ВЕЧАР СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ І СМУТКУ

Да 35-годдзя чарнобыльскай трагедыі тэлеканал «Беларусь 3» 26 красавіка пакажа месу Джузепе Вердзі «Рэквіем» у выкананні сусветна вядомых артыстаў оперы.

На сцэне Вялікага тэатра Беларусі 25 красавіка прагучыць адна з самых вядомых работ італьянскага кампазітара Джузепе Вердзі «Рэквіем», які майстар напісаў пад уплывам шэрагу асабістых трагедый, калі адзін за адным сышлі з жыцця блізкія яму людзі. Бессмяротны твор Вердзі цягам часу знайшоў водгук ва ўсім свеце, стаўшы не толькі часткай рэпертуару шматлікіх тэатраў, але і сімвалам высокіх пачуццяў, светлай памяці і смутку.

Напярэдадні 35-годдзя аварыі на Чарнобыльскай АЭС Вялікі тэатр ушануе памяць ахвяр тых трагічных падзей выкананнем «Рэквіема», у якім возьмуць удзел зоркі тэатральных пляцовак розных краін — прыма Марыінскага тэатра Кацярына Семянчук, уладальніца шматлікіх прэмій, у тым ліку Гран-пры конкурсу BBC «Спявак свету» ў Кардыфе (2015) Надзея Кучар, саліст Гамбургскай оперы Аляксандр Рославец і беларускі тэнар з аўстрыйскага Graz Opera, пераможца «Апераліі» Пласіда Дамінга (2018) Павел Пятроў. Для кожнага з салістаў выкананне месы Дж. Вердзі на сцэне Вялікага тэатра стане першым. За дырыжорскім пультам гледачы ўбачаць Дзмітрыя Мацвіенку, а галоўным хормайстрам выступіць народная артыстка Беларусі Ніна Ламановіч.

Тэлеверсію жалобнай месы сацыякультурны канал прадставіць 26 красавіка ў 18.40.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 138

З 8 да 18 красавіка 2021 года ў Мінску праходзілі чэмпіянаты Беларусі па шашках-100 сярод мужчын і жанчын. У мужчынскім турніры нечакана, але вельмі ўпэўнена перамог кандыдат у майстры Георгій Выдзерка — 19 ачкоў з 22 магчымых. На другім месцы апынуўся майстар Уладзіслаў Валюк — 16 ачкоў, «бронза» ў гросмайстра Сяргея Насевіча — 15 ачкоў. У жанчын перамагла міжнародны гросмайстар Вольга Федаровіч — 17 ачкоў з 22 магчымых. Сярэбраны і бронзавы медалі — у майстроў Вікторыі Нікалаевай і Паліны Петрусёвай (па 16 ачкоў).

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі Генадзя Андрэева (Латвія)

№ 48



№ 48

Белыя простыя шашкі: g1, f2, g3, c5, g5, a7, e7 (7)

Чорныя простыя шашкі: d2, a3, c3, e3, d4, e5, b6, f6, c7 (9)

№ 49

Белыя простыя шашкі: e1, g1, d2, e3, b4, a5, c5, g5 (8)

Чорныя простыя шашкі: c3, g3, f4, e5, d6, h6, e7, g7 (8)

№ 50

Белыя простыя шашкі: 42, 33, 28, 21, 23, 24, 17 (7)

Чорныя простыя шашкі: 36, 38, 26, 13, 14, 7, 8, 10 (8)

№ 51

Белыя простыя шашкі: 49, 50, 37, 40, 32, 21, 16 (7)

Чорныя простыя шашкі: 45, 39, 25, 18, 19, 6, 8 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: 8–9 мая ў Гомелі пройдзе Кубак Чорнай пешкі, у рамках якога адбудзецца турнір па шашках-64. Даведкі: Леінаў Раман, тэл. (+375) 44 538 10 65, Барашка Ганна, тэл. (+375) 29 631 04 03, e-mail: blackpawnby@gmail.com

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 136 ад 26.03.21.

№ 41 1.d2-c3 f4:b4 2.f2-g3 h2:f4 3.c1-d2 a3:e3 4.d4:f2 b6:d4 5.d6-c7 d8:b6 6.f2-e3 f4:d2 7.e1:g7 f8:h6 8.h4:d2 a7-b6+

№ 42 1.a3-b4 d4:b6 2.f4-e5 f6:d4 3.h6:f4 e3:g5 4.c1:c5 b6:d4 5.h4:g1 a7-b6 6.g1:a7 h2-g1

7.b4-c5+

№ 43 1.f4-e5 d4:b6 2.a5:c7 c3:a5 3.h6:f4 f6:d4 4.c7-d8 e3:g5 5.h4:f6 e7:g5 6.c1:g1 g5-h4 7.d8-f6 d4-e3 8.f6-a1 e3-d2 9.a3-b4 a5:c3 10.a1:d4+

№ 44 1.d6-e7 f4:b4 2.a3:c5 f8:b4 3.h2:a3+

№ 45 1.b2-a3 x9/51 — 0.04 a7:g5 2.h2:e1 f6:d4 won 3.e1-f2 d4-c3 4.a3-b4 c3:a5 5.f2-e1+

№ 46 1.d4-e5 x3/51 — 0.02 d6:b4 2.a3:c5 f4:b4 3.h2:a3+

№47 1.g5-f6 e7:e3 2.d2:f4 c5:e7 3.c1-b2 a3:g5 4.h4:c3+

Першыя правільныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Лойка (Украіна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Жыццёвыя невыпадковасці ад Аляксандра Яфрэмава

Вядомы рэжысёр, акцёр, мастацкі кіраўнік мінскага Тэатра-студыі кінаакцёра Аляксандр Яфрэмаў 1 мая адзначыць юбілей. Яго любяць і ведаюць прыхільнікі кіна- і тэатральнага мастацтва. Напрыклад, такія фільмы як «Давай пажэнімся», «Экзамен на дырэктара», «Рыфмуецца з каханнем», «Снайпер. Зброя помсты», «Танкіст» і многія іншыя выйшлі з-пад яго рэжысёрскага пяра. І ў дзень нараджэння маэстра на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць карціну «Павадыр», што дасць магчымасць аўдыторыі згадаць вядомае ці пазнаёміцца з ранняй творчасцю рэжысёра.

Фільм з'явіўся на свет у 2001 годзе на кінастудыі «Беларусьфільм», таму таксама ўжо мае 20-гадовую вытрыманасць... Нічога не азмрочвала вясёлае студэнцкае жыццё Арцёма (Пётр Юрчанка-малодшы), пакуль аднойчы ён не трапляе разам са сваім сабакам у вулічную бойку, ратуючы незнаёмца ад зладзеяў-хуліганаў. У выніку юнака затрымліваюць на 15 сутак, даўшы яму дзве гадзіны на тое, каб некуды ўладкаваць свайго Хлопчыка (гэта мянушка гадаванца). Аднак усе спробы знайсці часовага гаспадара для ратвейлера аказваюцца марныя. І тут, на шчасце, наш герой сустракае незнаёмую дзяўчыну Сашу (Валерыя Арланава), у якую закахаўся з першага погляду, і яна згаджаецца пакінуць у сябе сабаку. Калі ж Арцём вяртаецца праз два тыдні, то заўважае, што яго выратавальніца невідушчая. Таму хлопец вырашае пакінуць дзяўчыне свайго гадаванца, а разам з тым і незаўважна пасяліцца ў яе кватэры...

У акцёрскім саставе фільма заяўлены, акрамя выконваючых ролі галоўных герояў, таксама акцёры Аляксандр Кашпераў, Вера Палякова, Віктар Манаеў, Анжэла Караблёва, Анатоль Кот, Джэмал Тэтруашвілі і іншыя. Дарэчы, самога рэжысёра таксама можна сустрэць тут у адным з эпізодаў. Акрамя таго, Аляксандр Васілевіч выступіў сцэнарыстам кінастужкі. «Павадыр» у свой час стаў лаўрэатам розных конкурсаў. Так, у арсенале яго ўзнагарод ёсць спецыяльны дыплом глядацкага журы «Срэбра Лістапада», спецыяльны прыз Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі «За вернасць маральным ідэалам у мастацтве» Аляксандру Яфрэмаву на кінафестывалі «Лістапад» (2001). Выканаўца галоўнай ролі Валерыя Арланава была адзначана прызамі «За найлепшую жаночую ролю» на 4-м Міжнародным кінафестывалі «Брыганціна-2001» і на 1-м Міжнародным фестывалі прафесійных кадраў кіно (Бранск, 2001) і атрымала Прыз глядацкіх сімпатый на «Лістападзе-2001». Адметна таксама і тое, што актрысу можна ўбачыць і ў іншых фільмах рэжысёра, сярод якіх «Дунечка», «Рыфмуецца з каханнем», «Танкіст», «Яна не магла іначай»...

Здараецца, што, атрымаўшы ў камісіі накіраванне на працу, чалавек нават не даязджае да адрасата, хоць ёсць дамоўленасць з кіраўніком, які чакае патэнцыйнага работніка. Сёння, як канстатуе Пётр Віктаравіч, незанятыя хочуць працаваць блізка ад дома, мець зарплату не менш за тысячу рублёў. Ёсць грамадзяне з дзвюма вышэйшымі адукацыямі, але яны ніколі не працавалі па спецыяльнасці. Дыплом, можна сказаць, з моманту заканчэння навучальнай установы праляжаў на паліцы. Таму ў такіх дыпламаваных выпускнікоў няма вопыту ў набытай прафесіі. Ім прапаноўваюць прайсці курсы па перанавучанні, на гэта па лініі ўпраўлення працы і сацыяльнай абароны выдзяляюцца сродкі. А запатрабаваны на рынку працы ў асноўным будаўнікі, зваршчыкі, цырульнікі і прадаўцы.

Абяцаюць, што выправяцца

На дварыXXI век, і такое паняцце, як сям'я, дзе дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, павінна знікнуць наогул. Сёння ёсць магчымасць зарабіць, калі хочаш працаваць, каб забяспечыць дастойнае жыццё сваім блізкім, лічыць Пётр Навіцкі. На жаль, у Барысаўскім раёне больш як 240 неўладкаваных сем'яў.

— Мы іх выклікаем на пасяджэнні камісіі, гутарым, выхоўваем, ушчуваем, імкнёмся высветліць, што давяло бацькоў да асацыяльнага ладу жыцця, — расказвае Пётр Віктаравіч. — За кожнай такой сям'ёй замацаваны работнікі райвыканкама, дэпутаты раённага Савета, якія, так бы мовіць, шэфствуюць над імі. Зразумела, што і мы таксама з імі працуем, наведваемся, цікавімся матэрыяльным становішчам, прывозім дзецям падарункі да розных свят.

Калі шэфы задаюць пытанне гора-бацькам, як яны апынуліся ў такім становішчы, звычайна тыя абяцаюць выправіцца.

— Сапраўды, сярод маіх падапечных дзве сям'і памянялі сваё жыццё, сталі на шлях выпраўлення і зняты з уліку. Аднак, на жаль, такіх няшмат, — сцвярджае мой суразмоўнік.

Спадзявацца на дзяржаву. А на сябе?

У раёне створана 18 аглядных камісій па супрацьпажарнай бяспецы, у тым ліку 12 з іх у сельвыканкамах. Штотыдзень, у асноўным па чацвяргах, яны наведваюць адзінока пражываючых, адзінокіх, ветэранаў, шматдзетныя сем'і, сем'і, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, злоўжываюць спіртным.

— На жаль, у 2020 годзе ў Барысаўскім раёне адбылося 134 пажары, у якіх загінуў 21 жыхар. У асноўным гінуць людзі, якія сябруюць з «зялёным змеем». З гэтай катэгорыяй грамадзян мы шчыльна працуем, вывучаем бытавыя ўмовы. Калі ёсць магчымасць, аказваем матэрыяльную дапамогу з раённага бюджэту на рамонт пячнога ацяплення, электраправодкі, устаноўку супрацьпажарнага апавяшчальніка. Зразумела, што адначасова ўсім не дапаможаш. Лічу, што людзі самі павінны паклапаціцца аб сваёй бяспецы. Але многія спадзяюцца толькі на дзяржаву. Аднойчы наведаўся ў сям'ю, дзе дзеці ў небяспечным становішчы. За кошт тэрытарыяльнага цэнтра ім атынкавалі печку. А маладыя, дужыя бацькі задаюць пытанне: «А чаму не пабялілі?» — дзеліцца суразмоўнік.

На думку Пятра Навіцкага, заслонай для такога ўтрымання можа стаць больш жорсткае заканадаўства па некаторых пытаннях.

«Мёртвыя» вёскі і знос домаў

На тэрыторыі раёна налічваецца 299 населеных пунктаў, восем з іх наогул «мёртвыя», тут няма ніводнага жыхара. У 12 пражывае па адным чалавеку, у 94 — ад двух да 10. Атрымліваецца, што 114 населішчаў неперспектыўныя. Раней гаспадары мелі пры доме як мінімум па 25—30 сотак, якія цяпер зарастаюць.

— Мы шчыльна працуем са спадчыннікамі па Указе Прэзідэнта № 357 ад 4 верасня 2018 года «Аб пустых і старых дамах». Канешне, ён нам дапамог у тым плане, што даў больш працяглы перыяд на працэдуру зносу ў параўнанні з Указам № 100. Мы павінны апытаць суседзяў: з'яўляецца тут спадчыннік або не, падрыхтаваць пэўны пакет дакументаў. Затым сельсаветы падаюць іх у аддзел жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а райвыканкам прымае адпаведнае рашэнне. І тады мы вызначаем, што рабіць: звяртацца ў суд, зносіць пабудову ці прадаваць. У асноўным я настройваю старшынь сельвыканкамаў вырашаць пытанне праз суд. У нас быў выпадак. Знеслі дом, а літаральна праз месяц аб'явіўся спадчыннік і падаў судовы іск. Давялося яму заплаціць.

Дадам, што пры зносе дамоў і гаспадарчых пабудоў часам узнікае праблема з прысядзібнымі ўчасткамі. Магутная калгасная тэхніка не можа праехаць, каб іх зараць. Там, дзе надзел прымыкае да палёў севазвароту, перадаюць яго сельгасарганізацыі. Калі зямля знаходзіцца каля лесу, аддаюць лясгасу. Але ёсць участкі пасярэдзіне вёскі, якія нікому не патрэбныя. Іх стараюцца абкошваць, каб не стваралі пажара-небяспечную сітуацыю.

На могілках павінен быць наглядчык

У Барысаўскім раёне налічваецца шмат грамадзянскіх могілак. Па законе два месцы для пахавання грамадзянам даюцца бясплатна. За трэцяе ці чацвёртае месца чалавек павінен заплаціць у тым выпадку, калі могілкі афармлены, ёсць акт на зямлю і інвентарызацыя магіл. Грошы за дадатковыя пахаванні можна накіроўваць на добраўпарадкаванне. Знаходзяцца добрахвотнікі, якія прапаноўваюць адкрыць разліковы рахунак, куды пералічваць грошы на навядзенне парадку на могілках. Быў выпадак, калі такім чынам людзі падсыпалі дарогу да пагоста, каб без праблем наведваць магілы сваякоў і продкаў.

Як лічыць Пётр Віктаравіч, на афармленых могілках павінен быць наглядчык. Бывае, прыехалі сваякі, пахавалі родзіча без узгаднення з мясцовымі ўладамі. Як кажуць, да кожнага кантралёра не прыставіш. Разам з тым яны павінны звярнуцца ў сельсавет, дзе ім пакажуць месца для магілы. Навядзенне парадку на могілках — справа не аднаго дня. Трэба доўга і карпатліва працаваць з насельніцтвам, каб не было стыхійных пахаванняў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 22 красавіка 2021 года.

Еш ананасы, яблыкі жуй!

Як падтрымаць імунітэт без аптэчкі?

З авітамінозам у нас прынята змагацца па-старому — закручваючы з лета слоікі з дачным ураджаем гародніны і садавіны. Ператвараючы іх у кампоты і кансервы, пакаленні нашых мам і бабуль кармілі хатнімі закруткамі сям'ю зімой, каб папоўніць недахоп вітамінаў. І мелі рацыю! Як выявіць авітаміноз і чым ён небяспечны, як не страціць карысныя ўласцівасці прадуктаў, навошта салату лепш рэзаць буйнымі кавалкамі і есці свежапрыгатаванай, чаму агурок і памідор канфліктуюць у адной талерцы, раскажа нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гумэн ГУРБАНІДЖАД.

— Вітаміны — гэта той горад, карта якога да канца нам невядомая і сёння. А раней людзі ўвогуле мала пра іх ведалі. Такія захворванні, як беры-беры, рахіт, цынга, курыная слепата, узнікалі ад недахопу вітамінаў і былі звязаны з асаблівасцямі харчавання пэўнай мясцовасці ці народа. Калі маракі ішлі ў мора, у многіх з іх ад недахопу вітаміну С пачыналася цынга. Яны паміралі ад інфекцыі зубоў і крывацёку дзясен. Толькі з часам людзі зразумелі, што калі дадаць лімон ці лімонны сок у рацыён маракоў, то захворванне знікне.

Вітаміны — гэта рэчывы, якія наш арганізм не можа сінтэзаваць, мы павінны іх атрымліваць з прадуктаў харчавання пастаянна. Ёсць адно невялікае выключэнне — вітамін D, і часткова наш арганізм можа выпрацоўваць яго пад уздзеяннем ультрафіялетавага выпраменьвання.

Сёння вядома 13 найменняў вітамінаў. Многія новыя факты толькі адкрываюцца вучонымі. Амаль штогод з'яўляецца інфармацыя, як вітаміны ўзаемадзейнічаюць адзін з адным. Сусветная арганізацыя аховы здароўя сцвярджае, што здаровыя людзі амаль заўсёды могуць аднавіць дэфіцыт вітамінаў і мінералаў з дапамогай звычайнай ежы. Але тут трэба мець на ўвазе два моманты. Па-першае, чалавека, які штодзень падвяргаецца стрэсу, а гэта як мінімум усе жыхары вялікіх гарадоў, адназначна нельга аднесці да абсалютна здаровага. Па-другое, усе мы ведаем, наколькі моцна сённяшняя ежа адрозніваецца ад той, якую ўжывалі нашы продкі: мы вырошчваем агародніну без сонца, кормім жывёл гармонамі, каб атрымаць болей мяса ці малака, і іншае.

— Асноўная крыніца натуральных вітамінаў — гародніна і фрукты?

— Вясной многія чакаюць, што летам на дачным участку з'явіцца шмат садавіны і фруктаў і можна наесціся і назапасіцца вітамінамі да сярэдзіны зімы. На самай справе гэта міф. Гародніна, фрукты, зеляніва ўтрымліваюць усяго трычатыры віды вітамінаў. Як правіла, гэта вітаміны С, А, фоліевая кіслата, невялікая колькасць вітаміну К. А нам патрэбна 13 вітамінаў. Астатнія знаходзяцца ў прадуктах жывёльнага паходжання. Таму, калі мы лічым, што ад садавіны і гародніны атрымаем 100 % патрэбы ў вітамінах, гэта памылка. Калі харчавацца толькі раслінай ежай, могуць узнікнуць праблемы са здароўем.

У той жа час недахоп вітамінаў кароткі час не такі ўжо і небяспечны, бо наш арганізм уключае розныя механізмы і кампенсуе яго. Калі ж недахоп перарастае ў хранічную форму, гэта можа выклікаць пэўныя праблемы.

— Як жа тады вегетарыянцы? Яны сцвярджаюць, што адчуваюць сябе абсалютна камфортна, не ўжываючы прадукты жывёльнага паходжання.

— Па размяшчэнні зубоў можна высветліць, чым харчуецца тая ці іншая жывёла. У драпежнікаў больш развітыя пярэднія зубы, у траваедных — заднія. Паводле гэтай прыкметы чалавек — істота ўсёедная, нам патрэбна як мяса, так і раслінная ежа. Што датычыцца вегетарыянцаў, то насамрэч у іх ёсць недахоп пэўных відаў вітамінаў, але арганізм уключае кампенсацыйныя механізмы. Аднак гэта не сведчыць аб тым, што мы робім свайму здароўю падарунак, калі выключаем з рацыёну пэўныя віды ежы.

— У якіх вітамінах мы маем найбольшую патрэбу і якія ў нас найчасцей у дэфіцыце?

— Трэба сказаць, што вітаміны дзеляцца на вода- і тлушчараствараль-ныя. Водараствараль-ных, як правіла, мы павінны ўжываць больш, бо мы і трацім іх больш, і выводзяцца яны хутчэй, у той час як тлушчараствараль-ныя даўжэй затрымліваюцца ў арганізме. Недахоп тлушчараствараль-ных (а гэта вітаміны A, D, E, K) адчуваецца пазней, але і лішак іх можа істотна нашкодзіць.

Самае вялікая сутачная норма ўжывання — у вітаміну С. Яго мы трацім больш за ўсё. Ён адыгрывае ключавую ролю, бо ў першую чаргу змагаецца са свабоднымі радыкаламі, а значыць, з нашым заўчасным старэннем, падтрымлівае імунную сістэму, удзельнічае ў сінтэзе пэўных неабходных рэчываў, у прыватнасці калагену. Таксама ён патрэбны пры мышачных нагрузках, важны для трываласці нашых сасудаў. Вялікую колькасць вітаміну С, як вядома, утрымліваюць цытрусавыя, гародніна, зеляніва.

Вітаміны групы В важныя для работы нервовай сістэмы, яны ўдзельнічаюць ва ўтварэнні энергіі, уплываюць на імунітэт. Вітамін А, як і С, нейтралізуе акісляльнае дзеянне свабодных радыкалаў, пры яго недахопе ўзнікае так званая курыная слепата, калі ў прыцемках чалавек дрэнна бачыць. Вітамін К адыгрывае важную ролю ў гемастазе нашага арганізма: без яго немагчыма спыненне крывацёку.

— А што такое антывітаміны?

— Гэта рэчывы, якія выклікаюць зніжэнне ці поўнае спыненне дзеяння вітамінаў — часткова ці цалкам іх нейтралізуюць. Яны выкарыстоўваюцца ў навуковай сферы: калі мы вывучаем дэфіцыт вітаміну С, уводзім яго антывітамін у лабараторную мыш і можам назіраць эфект. Як і вітаміны, антывітаміны сінтэзуюцца ў гародніне і фруктах. Для чаго? Бо патрэбны баланс. Пры гэтым колькі б антывітамінаў ні знаходзілася ў прадуктах, усё роўна перавага ідзе на карысць вітамінаў. Антывітаміны адыгрываюць сваю ролю: ёсць многа навуковых работ пра тое, як з іх дапамогай падаўляюць рост пухлінных клетак і пэўных паталагічных бактэрый.

Антывітамін у вітаміну С — аскарбіназа. Яна цалкам блакіруе работу вітаміну С у нашым арганізме. Пад уздзеяннем кіслароду аскарбіназа можа выпрацоўвацца ў самік фруктах і гародніне: на разрэзе той жа яблык хутка цямнее. Таму, чым больш дробна мы іх рэжам, тым больш садзейнічаем утварэнню аскарбіназы. Лічыцца, што пасля шасці гадзін знаходжання салаты ў халадзільніку мы губляем больш за 50 % вітаміну С, а за суткі — амаль увесь. Прычым аскарбіназа разбурае вітамін С не толькі ў салаце. Калі яна трапляе ў наш арганізм, разбурае яго і там. Трэба памятаць, што вітамін С разбураецца і ад металічных паверхняў: калі мы рэжам гародніну ці фрукты нажом, на парэзе ўтвараецца аскарбіназа. Таму салату пажадана наразаць буйнымі кавалкамі і есці свежапрыгатаванай.

Ёсць і камбінацыі, якіх трэба пазбягаць. Па колькасці аскарбіназы адны з лідараў — агуркі. Калі мы агурок камбінуем з памідорам у салаце, то разбураем вялікую колькасць вітаміну С. Канешне, лепш старацца падбіраць кампаненты правільна, але нельга сцвярджаць, што, калі мы зробім нешта не так, у наш арганізм не трапіць вітамін С. Мы можам яго кампенсаваць пасля з іншымі прадуктамі. Таму неабавязкова вывешваць на халадзільнік табліцу і пралічваць камбінацыі. Дастаткова зрабіць свой рацыён разнастайным на працягу тыдня. Калі мы штодзень мяняем рацыён, то балансуем колькасць вітамінаў.

— Але ёсць і вітаміны, якія не сябруюць паміж сабой...

— Сапраўды, і гэта носіць назву вітаміннага канфлікту. Ёсць пэўныя вітаміны, якія нейтралізуюць дзеянне іншага ці не даюць яму засвойвацца. Канфліктуюць паміж сабой вітамін A і D, B_2 і B_1, B_2 і C, D і E, B_{12} і PP, B_{12} і E. Вітамін B_{12} самы канфліктны, ён не сумяшчаецца з вітамінамі С, Е і РР. А ёсць вітаміны, якія ўзмацняюць дзеянне адзін аднаго. Вядомая таблетка «Аевіт», калі камбінуюць два вітаміны — А і Е: яны дапамагаюць адзін аднаму засвойвацца.

Дарэчы, каб добра засвоіўся сок фрэш, у прыватнасці вітамін А, трэба невялікая колькасць тлушчу — дастаткова 1-2 кропель аліўкавага ці раслінага алею, каб забяспечыць лепшае ўсмоктванне.

Ёсць і пэўная група лекаў, якая канфліктуе з вітамінамі. Вядомы аспірын нейтралізуе вітамін С. Антыбіётыкі могуць парушаць засваенне вітаміну B_{12}. Такі ж эфект маюць некаторыя супрацьзачаткавыя таблеткі. Таму, калі людзі доўга прымаюць гэтыя прэпараты, трэба ўзмацніць прыём вітамінаў.

— А як тады ставіцца да таблетаваных вітамінаў, дзе адна таблетка ўтрымлівае ўсе? Як жа вітамінны канфлікт?

— Сучасныя тэхналогіі дазваляюць трымаць кожны з вітамінаў у мікракапсулах, і яны распадаюцца неадначасова. Калі мы прымаем вітамінны комплекс, усё разлічана так, каб пазбегнуць вітаміннага канфлікту.

— Ёсць шмат спрэчак наконт таго, ці засвойваюцца сінтэзаваныя вітаміны...

— Пры захворваннях, якія звязаны з дэфіцытам вітамінаў, мы прызначаем сінтэзаваныя комплексы. Бо каб атрымаць сутачную дозу пры дэфіцыце вітаміну С, трэба з'есці тры кілаграмы цытрусавых; для вітаміну В — буханку хлеба. Таму мы выкарыстоўваем сінтэзаваныя вітаміны і атрымліваем эфект. Калі б вітаміны не працавалі, мы б не змаглі лячыць такіх пацыентаў. Пры гэтым абапірацца толькі на сінтэзаваныя комплексы і казаць, што натуральныя вітаміны мне не патрэбны, няправільна. Ёсць меркаванне, што комплексныя вітаміны маюць толькі эфект плацэба. Не магу з гэтым пагадзіцца, бо любая таблетка мае гэты эфект, але тэмпература ці запаленне ад яго не знікаюць.

— З якімі захворваннямі патрэбна дадатковая вітамінная тэрапія?

— Пакутуюць ад недахопу вітамінаў людзі з лішняй масай цела. Здавалася б, яны шмат ядуць, і арганізм павінен быць «нашпігаваны» вітамінамі, але яны часта хварэюць на авітамінозы. Бо чым большая вага, тым больш трэба вітамінаў. Пастаянна прымаць вітамінныя комплексы павінны і пацыенты з цукровым дыябетам, людзі, якія маюць вялікае нервовае напружанне і стрэс, фізічныя нагрузкі. У іх вітаміны хутчэй расходуюцца.

Асобныя вітаміны прызначаюцца, калі маецца іх востры дэфіцыт. Але лепш іх прымаць комплексна, бо яны працуюць разам як адна каманда.

— Кава і нават гарбата дрэнна ўплываюць на вітаміны, гэта так?

— Кафеін, які ўтрымліваецца ў каве і гарбаце, мае лёгкі мачагонны эфект. Такім чынам, водараствараль-ныя вітаміны хутчэй выводзяцца з арганізма — ён не паспявае іх нават засвойваць. Таму таблетаваныя вітаміны нельга запіваць гарбатай ці кавай. Калі мы прымаем комплексныя вітаміны, гарбату і каву лепш не ўжываць за 45—60 хвілін да гэтага і столькі ж пасля. Тое ж самае датычыцца і прыёму ежы. Калі адразу пасля сняданку ці абеду мы п'ём каву, вялікую колькасць вітамінаў, у тым ліку групы В, мы губляем. Асабліва гэта праблематычна для дзяцей.

Курэнне пераўтварае многія вітаміны ў антывітаміны. Напрыклад, амаль цалкам разбурае вітамін С. Прычым чым больш мы дадаём вітамінаў, тым больш затрымліваем антывітамінаў. Курэнне цалкам зводзіць на нішто амалоджвальныя працэдуры, дзеянне касметычных сродкаў, бо вітаміны знішчаны і не могуць змагацца са свабоднымі радыкаламі, якія выклікаюць заўчаснае старэнне. Трэба проста кідаць курыць, іншага выйсця няма.

Алкаголь у празмернай колькасці, асабліва калі ён ужываецца разам з ежай, перашкаджае ўсмоктванню тлушчараствараль-ных вітамінаў. Таму ва ўсіх хранічных алкаголікаў мы бачым прыкметы недахопу вітамінаў.

Зразумела, што чалавеку, які курыць ці злоўжывае алкаголем, пэўных вітамінаў не хапае, але тут трэба найперш развітацца са шкоднымі звычкамі.

— Ці можна назапасіць вітамінаў на нейкі час?

— Некаторыя вітаміны могуць дэпаніравацца ў нашым арганізме і потым выкарыстоўвацца нейкі час. Вітамін B_{12} назапашваецца ў печані і пасля расходуецца. А група вітамінаў, пераважна водараствараль-ных, не можа назапашвацца. Найперш гэта датычыцца вітаміну С. Таму есці адразу шмат чагосьці, каб запасціся вітамінамі, няправільна. Лішак можа быць больш шкодным, чым недахоп. Калі малады арганізм атрымае больш, чым трэба, вітаміну D, ён закрывае зоны росту, дзіця застанецца невысокім. Пры лішку вітаміну К можа парушацца сістэма згусальнасці крыві.

— Як зразумець, што арганізму не хапае пэўных вітамінаў?

— Дакладную інфармацыю дае лабараторная дыягностыка. Яна робіцца дастаткова доўга, гэта больш складанае даследаванне, чым агульны аналіз крыві. Ёсць яўныя прыкметы: калі трэскаюцца вугалкі рота, гэта сведчыць пра недахоп вітаміну B_1; калі пастаянна на целе сінякі і гематомы — не хапае вітаміну С. Але каб дакладна гэта ведаць, трэба звярнуцца да ўрача ці здаць аналізы на пэўныя вітаміны.

Алена КРАВЕЦ.

БАНК ДАБРАБЫТ

Открытое акционерное общество «Банк Дабрабыт»
220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, д. 49, пом. 1, УНН 807000002

Бухгалтерский баланс на 1 апреля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.04.2021	01.01.2021
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101		28 655	38 858
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		140 411	151 868
5	Средства в банках	1104		138 676	133 962
6	Ценные бумаги	1105		299 780	281 904
7	Кредиты клиентам	1106		734 545	710 100
8	Производные финансовые активы	1107		2 059	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		176	176
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		45 018	45 170
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		90	91
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		3 668	3 102
13	Отложенные налоговые активы	1112		8	8
14	Прочие активы	1113		27 775	19 675
15	ИТОГО активы	11		1 420 861	1 384 914
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
17	Средства Национального банка	1201		38 124	90 000
18	Средства банков	1202		183 928	136 623
19	Средства клиентов	1203		911 340	910 185
20	Ценные бумаги банка	1204		100 900	65 200
21	Производные финансовые обязательства	1205		-	2 269
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
23	Прочие обязательства	1207		16 438	11 828
24	ВСЕГО обязательства	120		1 250 730	1 216 105
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ				
26	Уставный фонд	1211		47 682	47 682
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		15 914	13 723
29	Фонд переоценки статей баланса	1214		27 279	27 704
30	Накопленная прибыль	1215		79 256	79 700
31	ВСЕГО собственный капитал	121		170 131	168 809
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		1 420 861	1 384 914

Отчет о прибылях и убытках на 1 апреля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.04.2021	01.04.2020
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		26 263	24 066
2	Процентные расходы	2012		16 001	14 465
3	Чистые процентные доходы	201		10 262	9 601
4	Комиссионные доходы	2021		12 499	9 033
5	Комиссионные расходы	2022		2 421	2 872
6	Чистые комиссионные доходы	202		10 078	6 161
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(1 966)	1 398
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		940	182
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		3 717	3 622
11	Чистые отчисления в резервы	207		1 860	2 084
12	Прочие доходы	208		3 092	939
13	Операционные расходы	209		12 714	10 744
14	Прочие расходы	210		746	957
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		10 803	8 118
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		2 646	1 011
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		8 157	7 107

Председатель Правления И.В. Лихогруд

И.о. главного бухгалтера С.С. Запольская

Квартальная индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на следующей странице интернет-сайта банка:
https://bankdabrabyt.by/about/finance/

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 16, выдана Национальным банком Республики Беларусь 28 января 2019 года.
УНП 807000002

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

***ОРГАНИЗАТОР**: ЛУКОМЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ*

№ лота	Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер	Целевое назначение	Площадь (га)	Кадастровый номер	Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб.	Начальная цена, руб.	Сумма задатка 10 %, руб.
1	Витебская обл., Чашникский р-н., д. Белая Церковь, ул. Приозерная, 5У	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,2162	225183013101000382	1919,78	4 000,00	400,00

Условие проведения аукциона:
наличие не менее двух участников;
заключение с Лукомльским сельским исполнительным комитетом соглашения;
победителю аукциона, либо в случае признания аукциона несостоявшимся, единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность:
– возместить затраты, связанные с проведением аукциона;
– внести плату за земельный участок.
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории:
подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.
Аукцион состоится **24 мая 2021 в 15.00** по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.
Заявления и пакет необходимых документов представляются участниками с 8.00 до 17.00 со дня опубликования настоящего извещения и до **18 мая 2021** включительно по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.
1. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка, кроме того, в комиссию представляются:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования, а представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
Сумма задатка перечисляется на расчетный счет BY68AKBB36413290522002200000 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300986851, код платежа – 4901, получатель – Лукомльский сельский исполнительный комитет.
Оплата стоимости предмета аукциона, подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.
Контактные телефоны: 8 (02133) 6 41 45, 6 05 30.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир» (продавец) извещает о проведении 24 мая 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС, бел.руб.
Местонахождение имущества: г. Гомель, ул. Войсковая, 16			
1	**Грузовой бортовой тентовый MAZ 437143 332**, рег. № AI 1170-3, номер кузова (рамы) Y3M437143B0000926, 2011 г. в., состояние удовлетворительное, пробег – 479 979 км	**17 050,00**	852,50
2	**Грузовой бортовой тентовый MAZ 437143 332**, рег. № AI 1171-3, номер кузова (рамы) Y3M437143B0000930, 2011 г. в., состояние удовлетворительное, пробег – 443 082 км	**17 050,00**	852,50
3	**Грузовой самосвал GAZ -3507**, рег. № АК 7223-3, номер кузова (рамы) XTH531400L1351479, цвет темно-синий, 1990 г. в., состояние удовлетворительное, пробег – 45 184 км	**4 730,00**	236,50
4	**Экскаватор ЭО-2621В**, рег. № 9526 ГТ, 1987 г. в., двигатель дизельный, шасси №556010	**7 260,00**	363,00

Продавец: ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир», г. Гомель, ул. Севастопольская, 106. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 25-49-97, 8(033) 372-87-77 – начальник транспортного цеха Туманов Александр Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1).** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир»):** р/с BY86 BLBB 3012 0400 0783 1600 1007 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНН 400078316, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2).** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 апреля 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 20 мая 2021 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**
Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017)
298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY
Продавец: ОАО «Хойникский КБО» (УНП 400056519), 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 28, тел.: +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.
Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: 07 мая 2021 г. 09.00-17.00 на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Капитальное строение, инв. № 343/С-94164, площадь – 1266,0 кв. м (Дом быта), Гомельская обл., г. Хойники, ул. Карла Маркса, 27	218 400,00
2	Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4198	20,00
3	Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4199	20,00
4	Станок для изготовления ключей, 2005 г. в., инв. № 4204	1040,00
5	Обувная швейная машина Xflysphing-2972, 2005 г. в., инв. № 1037	328,00
6	Водонагреватель «Аристон», 2012 г. в., инв. № 7089. Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2003 г. в., инв. № 7086	3624,00
7	Сейфы металлические в ассортименте (3 шт.) (2-секц. – 1 шт., 1-секц. – 2 шт.)	153,60
8	Воздухонагреватель, 2012 г. в., инв. № 7091	48,00

Местонахождение – п. 2-8 Гомельская обл., г. Хойники, ул. К. Маркса, 27, Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.
Для участия в торгах необходимо в срок с 09.00 24.04.2021 г. по 17.00 06.05.2021 г. 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 07.04.2021 г.

Информация о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, **тел.: (0212) 24-63-12, +375 (29) 5100763,** e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.
Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 12,11 кв. м на 2-м этаже капитального строения с инв. № 241/С-6084 (наименование – здание узла связи, назначение – здание административно-хозяйственное) по адресу: Витебская обл., Дубровенский р-н, г. Дубровно, ул. Комсомольская, д. 15 для размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Нач. цена:** 51,16 бел. руб.
Дата, время и место проведения аукциона: 25.05.2021 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Извещение о проведении открытого аукциона опубликовано 21.04.2021 на сайтах Государственного комитета по имуществу http://www.gki.gov.by/, https://au.nca.by/ (№ 5502), Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/.

Утерянный бланк полиса формы 2РН, 2РП серии КЕ № 0123223 ЗАСО «КЕНТАВР» считать недействительным. УНП 100985903

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

1-я очередь строительства 1-я секция в составе объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр-т Жукова» в г. Минске.
Опубликованную в газете «Минский курьер» от 20.12.2019 № 145 (3359).
Этапы и сроки реализации строительства: строительство объекта предусматривается в 3-й очереди, начало строительства 1-й очереди – декабрь 2019 г., завершение строительства 1-й очереди – август 2021 г.
Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию: август 2023 г.
УНП 191581623

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

3-я очередь строительства 3-7-я секции в составе объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр-т Жукова» в г. Минске.
Опубликованную в газете «Звязда» от 26.02.2021 № 37 (29406).
Этапы и сроки реализации строительства: строительство объекта предусматривается в 3 очереди, начало строительства 3-й очереди – март 2021 г., завершение строительства 3-й очереди – октябрь 2023 г.
Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию: октябрь 2023 г.
УНП 191581623

ЗГАРЭЛА ВЯНДЛЯРНЯ

І ТАКОЙ БЯДЫ...

Добрае сала даспадобы многім — можа, нават усім.

Пра тое, як яго лепш павэндзіць, інфармацыі шмат. У інтэрнэце пішуць, што найлепш падыходзіць пілавінне ліставых дрэў (ні ў якім разе не хвойных, канцэрагенных)...

У нашай жа вёсцы вэндзілі толькі ядлоўцам. Яго, па-першае, процьма была на блізкіх схілах, а па-другое, сала бы мяса ад яго набываюць проста незвычайны, непаўторны смак!

Карацей. У вёсцы і амаль што ў суседстве жылі дзве сям'і. У адной падрастаў сынок, у другой — дачка. Яны разам хадзілі ў школу, разам пасля яе не паступілі ў інстытут. Дзяўчына пасля гэтага, не дужа засмуціўшыся, адразу ж пайшла працаваць у школьную бібліятэку, хлопец — стаў «шукаць сябе» і ўсё часцей прыкладацца да чаркі.

З гэтым трэ было нешта рабіць, і бацькі іх, бачачы, што дзеці не супраць, на «тайным савеце» надумалі іх пажаніць. Адпаведна — справіць вяселле.

Наконт гарэлкі ды памідораў-агуркоў праблемы не было — самагонка, жнівень, наконт скаромнага — яна існавала, бо да Каляд жа далёка яшчэ...

Дамовіліся, што адзін са сватоў заколе парсюка, другі — каб смачней было, навэндзіць мяса-каўбас.

Для гэтага Ваціх (ён на цагельні працаваў) навазіў дадому бракаванай цэглы, збудаваў у гародзе невялічкую вяндлярню.

Будучы сват даставіў туды мясныя прадукты, удвух яны падчапілі іх на крукі — распачалі працэс...

Тут варта заўважыць, што адкрыты агонь зусім не для яго: ядловец гарыць як порах... А трэба, каб ён лёгенька тлеў, дым пускаў густы і гарачы, прычым досыць доўга — не адну-дзве гадзіны. А таму — кантроль ды кантроль!

У першы дзень ён, вядома ж, быў. У другі — сваты засумавалі: вырашылі, што адзін збегае ў краму па бутэльку і тым самым разнастаіць гадзіны чакання.

І сапраўды, пасля прынятага «працаваць» у вяндлярні стала лягчэй. Аднак ненадоўга: у будынінцы штось бабахнула, над гародам узняўся дым — чорны, густы... Успыхнуў ядловец, загарэлася сала. А гарыць яно так (да таго ж на вятры)... Не дай бог каму бачыць!

Сваты забегалі: дружна пахапалі вёдры, сталі насіць ваду, заліваць агонь...

Вяндлярню ў выніку патушылі. Вяселле справілі. А гісторыю гэту я расказаў для таго, каб паведаміць, што не бывае таго дрэнна-га, каб на добрае неяк не выйшла. У людзей вось сала з мясам перад вяселлем згарэла... Бяда як быццам? Аднак пажар той бачыў жаніх. І ведаў, што стала прычынай...

З таго, не з таго, але гарэлкі ён цяпер і ў рот не бярэ. З жонкай дзяцей гадуюць, дапамагаюць бацькам — па-людску жывуць.

Што цікава, на месцы былой вяндлярні грады сягоння садзяць.

Мікалай М.,
Аршанскі раён.

ПРЫГАЖОСЦЬ ПРЫГЛЯДЗІЦЦА...

У тыя ўжо далёкія часы нашы медыкі рэдка бывалі ў замежных камандзіроўках. «Працэс» адпраўкі іх толькі пачынаўся: некага пасылалі, каб павучыўся, пераняў чужы вопыт, некага — наадварот, каб падзяліўся сваім. У любым выпадку, некуды з'ездзіць, паглядзець, як працуюць калегі, як людзі жывуць, пахадзіць па крамах (не без таго) ды нешта прывезці і хацелася, і прэстыжна было...

Вось толькі шчасціла на гэта далёка не ўсім. Адзін доктар, напрыклад, спаў і сніў, што яго накіруюць. Але час пралятаў, за мяжу ездзілі іншыя, і тады...

Падышоў ён да маёй сяброўкі (яна ў той час працавала ў бальніцы намесніцай галоўнага ўрача па кадрах) і, што называецца, напрамілы бог папрасіў паспрыяць, закінуць слоўца.

Аляксандраўна ведала: у выпадку з замежнымі камандзіроўкамі яны, тыя словы (а тым больш яшчэ і знізу...), анічога не значаць — нават прамаўляць іх сэнсу няма, аднак цуд чамусьці здарыўся: галоўны ўрач прапанаваў таму доктару з'ездзіць за мяжу. У чалавека збылася мара! У яго нават крылы выраслі...

Перад адлётам ён забег «у кадры» падпісаць камандзіроўку, падзякаваў Аляксандраўне, а заадно спытаў, які ж ёй падарунак прывезці?

Сяброўка мая — жанчына з гумарам: смехам сказала, што выраслa ў лесе — высокай і роўненькай: бракуе, маўляў, жаночых вабнотаў — хоць сабе спераду, хоць сабе ззаду... Але ж іх, маўляў, ніхто не прывязе...

Пажартавала так і забылася, а вось доктар — не. Прыязджае ён з камандзіроўкі і — не паверыце — прывозіць ёй прыгожыя штучныя... грудзі.

Цырк, ды і годзе! Адпаведна, і насіць яго — дома альбо на рабоце — сяброўка не разлічвала, а вось у час адпачынку...

Хутка і ўдзвюх з каляжанкай яны сабраліся ў санаторый — так, на ўсякі выпадак узялі з сабой заморскі падарунак. Дзён колькі пазагаралі, каб зраўняўся колер, прымералі і ахнулі! Грудзі — амаль не адрозніць! Ну чыста жывыя, сваe! Дык чаму б тады не насіць?! А тым больш на танцы?.. Сяброўка тую прыгажосць начапіла, зверху на яе накінула лёгкую блузачку з вялізным выразам — і амаль адразу ж убачыла, што гэта працуе. Ды яшчэ як! Мужчыны, што яшчэ ўчора і ў той бок не глядзелі, сёння ўжо свідравалі яе вачыма, наперабой запрашалі танцаваць, абсыпалі камплімentамі!

Добрае слова і кошцы прыемнае, а жанчыне — і пагатоў. «Вось што значаць прыгожыя грудзі!» — думала сяброўка...

Праўда, не сказаць, каб доўга: да той пары, пакуль каўказец адзін не «прыліп»: у круг не вывеў — і раз, і другі, і трэці... Пакуль, нахіліўшыся да самага вушка, не прашаптаў ёй, што жаночых грудзей за жыццё сваё бачыў шмат, прычым розных — і вялізных, і маленькіх... А вось каб адна з іх на плячы была, — ніколі не сустракаў...

Аказалася, што гэтая заморская прыгажосць і ў той час (цяпер, дзякуй богу, не ведаю) мацавалася не вельмі якасна: падвялі вытворцы жанчыну...

Таму штучныя грудзі яна больш не насіла. Але ж казала, што бераж э — як напамін пра часы і норавы, пра цікавых людзей, якім дай бог і кахаць, і мець усё натуральнае, бо недарэмна ж кажуць, што прыгажосць прыглядзіцца, — розум спатрэбіцца.

А. Чайкоўская,
г. Гомель.

ЯКОЙ ПАДМАНЛІВАЙ БЫВАЕ ЗНЕШНАСЦЬ...

Сваю праўдзівую гісторыю я пачну з таго, што мой муж — заўзяты рыбак, прычым не з дзяцінства, як многія іншыя, а, можна сказаць, з пачатку дарослага сямейнага жыцця. Гэта значыць, што цешча яго жыла ў невялічкай вёсачцы на беразе Шчары, што ў нас на рыбалку хадзілі ўсе...

Цяпер, праўда, рэчка змялела, рыбы ў ёй усё меншае, але не так даўно мужу пашчасціла на ляшча. Ды такога... Ледзь дамоў прывалок (бо па дарозе ўсім паказваў). А ўжо колькі радасці меў! Амаль як тады.

...Тады, помню, лета было і субота. Ён на рыбалку схадзіў, — вярнуўся дамоў. Улову, бачу, ніякага, а сам — вясёлы-вясёлы. Пытаю, з чаго б гэта? Кажа, ты не паверыш: русалку толькі што сустрэў!

Далей — з яго слоў.

«Сёння зайшоў я досыць далёка і ўверх па цячэнні. Па «дарозе», на золку яшчэ, патлатку заўважыў, слабы дымок над вогнішчам... А стаў вяртацца назад, на тым жа месцы — карціна алеем: нейкая маладзіца кветкі збірае. І з адзення на ёй — ну нічагуткі! Голая... Трэба разумець, адпачывае так, святкуе зліццё з прыродай...

А мне што рабіць? Стаю паводдаль і выбіраю: пайсці напрасткі — значыць спалохаць, даваць кругаля — значыць з рызыкай для здароўя пралазіць па кустах, ды і час марнаваць.

Хоць-нехаць выбраў я першае. Трохі наблізіўся — з шумам закінуў вуду. Ведаў, што марна (там жоўтае дно), але ж падумаў, што «русалка» ўбачыць мяне і схаваецца ці надзене што.

Аж, бачу, не: як гуляла яна, так і гуляе!

Ну не чакаць жа мне, пакуль ёй ногі забаляць ці зморыцца? Дадому трэба.

Кашляю, падыходжу бліжэй. «Русалка»... чакае і нават, здаецца, рада мне. «Ой, — кажа, — мы тут тры дні адпачываем і яшчэ нікога не бачылі. Вы праходзьце! Смялей, не бойцеся».

Прыгажосць, як вядома, страшная сіла, але ж я прайшоў — міма і досыць блізка. Дзеўка, як аказалася, была не голая: купальнік у яе пад колер цела».

...Факт, што ў рыбака майго, як заўжды, прыгода на прыгодзе: не раз ён з берага праводзіў журавоў, не раз палохаў чорных буслоў і палохаўся сам, наткнуўшыся на баброў ды дзікоў... Аднойчы сачыў за галодным вужом, які хацеў украсці ў яго найбольшую рыбіну...

І аднойчы ўбачыў «русалку».

Ірына Салата,
г. Гродна.

ШПАКОЎНЯ? ГЭТА ПРОСТА!

Неяк па тэлефоне размаўлялі мы з мінскай сяброўкай пра наша, пра «дзявочае»: пра вясну, якая такі прыйшла, хоць многім здавалася, што не будзе, пра птушак, што ўсё ж прыляцелі... Да жытла гаворка дайшла. Сяброўка мне: «О... Мы ў парку Чалюскінцаў неяк былі... Там столькі розных шпакоўняў!.. Ну проста палацы, творы мастацтва!»

І следам адразу ж: «Трэба на фазэндзе такіх зрабіць (фоткі засталіся)... Вось зараз жа пайду да канапы і папілюю»...

Паварот, згадзіцеся, нечаканы, бо, па-першае, мы, як быццам, размову яшчэ не скончылі? Па-другое, сяброўка мая — жанчына рашучая: у яе «зараз жа» — гэта «тут жа» (а не праз гадзіну ці заўтра). Па-трэцяе, можна падумаць, яна некалі пілку ў руках трымала (хіба для пазногцяў?). Па-чацвёртае, што ёй пілаваць у сталічнай кватэры і, дзе, урэшце, калі работа вось гэта пыльная, а ў яе там апартаменты — з дыванамі-вазонамі, з карцінамі, скуранымі канапамі...

Во, колькі думак у маёй галаве пасля слоў: «Пайду папілюю»...

А пытанне — толькі: «А як гэта пайду?..»

«Проста, — кажа сяброўка, — мужа пайду папілюю... А то на канапе ляжыць...»

Вось так бы, думаю, ды адразу!.. Гэта ж іншы зусім працэс! Прычым наш, жаночы! І не толькі ў вырабе шпакоўняў... Захацелася чаго, — падышла, папілавала. Глядзіш — і гатова ўсё. Не жыццё, а казка.

Шкада, што не ва ўсіх.

Соф'я Вароніна,
Рагачоўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж. *Пішыце. Свет захавaўся таму, што смяяўся. І думаў.*

Неасабісты суб'ектыў

МЯЖА САМААХВЯРНАСЦІ

Пытанне з папраўкай на пандэмію

